

Пазіцыі і інтарэсы «Свет ТБ»

СТАР. 3



Праграма тэлебачання на наступны тыдзень

20 КАНАЛАЎ



Фотасафары на межняка

СТАР. 8

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

18 ліпеня 2014 г. ПЯТНІЦА № 133 (27743) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

# ЗАДАННЕ НА ЗАЎТРА

## Прэзідэнт акрэсліў перад айчыннымі дыпламатамі эканамічныя і палітычныя кірункі знешняй палітыкі

**Учора Аляксандр Лукашэнка правёў нараду з кіраўнікамі дыпламатычных прадстаўніцтваў і консульскіх устаноў Беларусі, якія сабраліся ў Мінску. Сустрэча з дыпламатамі была планавай і прысвячалася падвядзенню асноўных вынікаў знешнепалітычнай і асабліва знешнеэканамічнай дзейнасці.**

Перш за ўсё кіраўнік дзяржавы закрануў глабальны кантэкст, у якім знаходзіцца наша краіна. «На нашых вачах імкліва мяняецца сітуацыя ў свеце. Мы сутыкнуліся з зусім новымі геапалітычнымі рэаліямі. Адсутнічае стабільнасць не толькі недзе далёка — у Паўночнай Афрыцы або на Блізкім Усходзе, а зусім побач, у нас пад бокам. І мы бачым: запалаць, выбухнуць можа ў любым месцы», — сказаў Прэзідэнт. «Адбываецца дэвальвацыя нормаў і прынцыпаў міжнародных паводзін, разбурэнне сістэмы міжнароднага права, якая стваралася дзесяцігоддзямі. Ясна адно: б'юць слабых, з моцнымі — лічацца. Таму нам трэба быць моцнымі — і палітычна, і асабліва эканамічна», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што Беларусь працуе над дасягненнем гэтых мэт і на ўнутраным, і на знешнім полі. На гэта накіраваны пастаўленыя Прэзідэнтам задачы нарошчвання экспарту, мадэрнізацыі эканомікі, павышэння ўзроўню жыцця. «Мы зыходзім з таго, што развіццё міжнароднага супрацоўніцтва, выпрацоўка знешнепалітычнай стратэгіі і тактыкі павінны жорстка праламляцца скрозь прызму нашых унутраных прыярытэтаў. Мэтай з'яўляецца пастаяннае павышэнне жыццёвага ўзроўню насельніцтва, умацаванне міжнародных пазіцый і суверэнітэту дзяржавы», — заявіў Прэзідэнт.

Беларусі неабходна максімальна прагматычна выкарыстоўваць сучасныя сусветныя тэндэнцыі, адзначыў кіраўнік дзяржавы.

«Новая сітуацыя справакавала рэзкі рост цікавасці да нашага рэгіёна з боку асноўных вядучых сусветных дзяржаў. І нам трэба старанна прааналізаваць гэтую сітуацыю, выкарыстоўваць яе максімальна прагматычна для прасоўвання сваіх нацыянальных інтарэсаў, абароны цэласнасці і незалежнасці краіны», — лічыць Аляксандр Лукашэнка.

Па словах кіраўніка дзяржавы, рэаліі сённяшняга дня такія, што імкненне вядучых сусветных гульцоў задзейнічаць сілавыя метады, ціск, эканамічныя і рэсурсныя перавагі стварае дадатковыя крыніцы напружанасці. «У гэтых няпростых умовах дзякуючы нашай шматвектарнай палітыцы мы змаглі выбудаваць устойлівую мадэль супрацоўніцтва з большасцю краін свету. Беларусь ведаюць і паважаюць як дзяржаву, якая праводзіць сапраўды самастойную знешнюю палітыку, уносіць істотны ўклад ва ўмацаванне міжнароднай бяспекі. Але самае галоўнае — мы навучыліся супрацьстаяць любому, нават самаму магутнаму знешняму націску», — падкрэсліў беларускі лідар.

На думку Прэзідэнта, напярэдадні 2015 года ціск на Беларусь прадказальна ўзрасце, што звязана з маючай адбыцца прэзідэнцкай выбарчай кампаніяй. «Я не раз казаў пра тое, што мы праводзім выбарчыя кампаніі не для Вашынгтона і Бруселя, роўна як і не для Крамля, а для сябе, у строгай адпаведнасці з нацыянальным заканадаўствам. І не трэба тут прыніжацца і спрабаваць кагосьці чымсьці задобрыць, каб нам паўсміхаліся або «пагладзілі па галаве», — падкрэсліў беларускі лідар. Прэзідэнт папярэдзіў, што трэба быць гатовымі да супрацьстаяння з глабальнымі гульцамі па пытаннях праводзімай Беларуссю палітыкі. «Так званая мяккая сіла будзе выкарыстоўвацца па максімуме па ўсім перыметры нашых межаў. На танках да нас пакуль ніхто не палезе, але ціск узрасце кратна», — сказаў ён.

Кіраўнік дзяржавы ў сваім выступленні закрануў і падзеі ва Украіне. «Нашы грамадзяне, з глыбокай горыччу назіраючы за падзеямі там, як ніколі ўсведамляюць сапраўдную каштоўнасць суверэнітэту і незалежнасці Беларусі. Па-іншаму глядзяць на стабільнасць і спакой у нашай краіне, — сказаў Прэзідэнт. — Мы дамагліся сваёй дзяржаўнасці дзякуючы гістарычнаму працэсу, які быў выкліканы распадам СССР. І нам трэба ўладкаваць тую дзяржаву, якую мы сёння маем. І гэта нялёгкая задача. Тым больш, што вакол яшчэ не ўсе да канца ўсвядомілі, што суверэнная Беларусь — гэта сур'ёзна і назаўжды», — рэзюмаваў Аляксандр Лукашэнка.

Гаворачы аб эканамічным складніку знешняй палітыкі, Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што прыцягненне прамых замежных інвестыцый з'яўляецца «архіважнай тэмай для беларускай эканомікі». Прэзідэнт лічыць, што праца ў гэтым кірунку вядзецца слаба. «Паслы скардзяцца на фактычную адсутнасць «ліквідных» інвестыцыйных прапаноў. Нават тыя з іх, якія сёння рэалізуюцца або знаходзяцца на стадыі глыбокай прапрацоўкі, з'яўляюцца пераважна вынікам палітычных дамоўленасцяў на высокім узроўні», — канстатаваў кіраўнік дзяржавы. Прэзідэнт адзначыў, што ў 2014 годзе за кіраўнікамі замежных устаноў Беларусі персанальна замацаваны 34 буйныя інвестыцыйныя праекты на агульную суму інвестыцый каля $4 млрд. Аляксандр Лукашэнка даручыў міністру замежных спраў прааналізаваць і далажыць, што зроблена. «Яшчэ раз падкрэсліваю: эканоміка — аснова ўсяго. У тым ліку стабільнасці ў дзяржаве і грамадстве. Я ўжо неяк казаў, што само існаванне нашай дзяржаўнасці можа разбурыць толькі эканоміка!» — падкрэсліў ён.

СТАР. 2

# КАНІКУЛЫ З ЧЫТАНКАЙ



Фота БЕЛТА.

*Рэспубліканская акцыя «Лета з добрай кнігай», арганізаваная Міністэрствам інфармацыі, Мінгарвыканкамам, абласнымі выканкамамі, Выдавецкім домам «Звязда», Беларускім рэспубліканскім саюзам моладзі, прадпрыемствам «Белкніга», упэўнена крочыць па ўсіх рэгіёнах краіны. У гарадскім пасёлку Акцябрскі да яе далучыліся дзеці з аздараўленчага лагера, які дзейнічае пры сярэдняй школе №2. Ані ЖУРАВАЙ канікулы запомняцца сёлета знаёмствам не толькі з новымі сябрамі з лагера, але і з героямі цікавых кніжак.*

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Аляксандр МРОЧАК, галоўны пазаштатны кардыёлаг Міністэрства аховы здароўя, дырэктар РНПЦ «Кардыялогія»:**

*«У нашай краіне ў першым паўгоддзі аперацыі па перасадцы сэрца выканалі 20 беларусам і шасці замежным грамадзянам. Часцей за ўсё па гэтую паслугу звяртаюцца грамадзяне Расіі, Украіны, Ізраіля, Грузіі і Казахстана. Сама працэдура трансплантацыі абыходзіцца ім прыкладна ў $50 тыс. Усе фінансавыя сродкі, атрыманыя за аказанне гэтага віду медыцынскіх паслуг замежнікам, накіроўваюцца на лячэнне беларусаў. Сёння ў лісце чакання знаходзіцца каля 20 пацыентаў, якія маюць патрэбу ў новым сэрцы. Донарская база ў рэспубліцы прадстаўлена добра, і на высокім узроўні працуе і сістэма дастаўкі органа».*

■ Год гасціннасці: ёсць ідэя!

# КАЛІ РЭКІ БЫЛІ... ТРАСАМІ

## Ідэя навукоўцаў даследаваць берагі Заходняй Дзвіны перад тым, як іх затопяць у выніку будаўніцтва ГЭС, мае шанц атрымаць міжнародную падтрымку

**Нагадаю, «Звязда» першай паведаміла пра тое, што энтузіясты хочуць зрабіць падрабязны вопіс таго, што акажацца пад вадой. Каб унікальныя здымкі сучаснай ракі захаваць для гісторыі, яны паўтораць даследаванне краязнаўцы дарэвалюцыйных часоў Аляксея Сапунова, які атрымаў вядомасць дзякуючы сваёй працы, прысвечанай Заходняй Дзвіне і наваколлям. Нядаўна падтрымку энтузіястам паабяцалі кіраўнікі праекта «Жывая гісторыя майго краю», які фінансуецца пры ўдзеле Еўрапейскага саюза.**

СТАР. 2



# СВЯТА ПЕРШАГА СНАПА

## На Нясвіжчыне прайшлі раённыя «Зажынкі». Яны далі старт уборцы збожжавых у Мінскай вобласці

**На полі адкрытага акцыянернага таварыства «Нясвіжскі райаграсэрвіс» сабраліся камбайнеры, механізатары, пераможцы мінулагодняга жніва, спецыялісты і кіраўнікі ўсіх гаспадарак раёна.**



Фота БЕЛТА.

Старшыню Мінскага абласнога выканаўчага камітэта Сямёна ШАПІРУ сустракаюць караваем.

Павіншаваць хлебаробаў са святам першага снапа прыехаў **старшыня Мінскага абласнога выканаўчага камітэта Сямён ШАПІРА,** якога сустрэлі караваем. Для Сямёна Барысавіча, дарэчы, гэта ўжо 31-е жніво. Але кожны раз пачатак уборкі збожжавых для яго незабыўны і хвалюючы момант. Кіраўнік сталічнага рэгіёна шчыра павіншаваў хлебаробаў з багатым ураджаем.

Ніва Нясвіжчыны сапраўды радуе.

— Па ацэнках спецыялістаў біялагічная ўраджайнасць у раёне — 60 цэнтнераў з гектара, што больш за мінулагоднюю, — адзначыў **старшыня Нясвіжскага райвыканкама Іван КРУПКО.** — Плануецца ўбраць 22,6 тыс. гектараў збожжавых за 15-17 дзён. На днях у раёне заканчваецца ўборка рапсу і ўсе гаспадаркі выведуць тэхніку, каб убраць збожжавыя.

Жнеі ў нацыянальных строях паднеслі старшыні аблвыканкама і старшыні райвыканкама першыя зжатыя снапы. Перад удзельнікамі «Зажынак» выступілі самадзейныя артысты. У добры шлях хлебаробаў благаславілі святары: праваслаўнай канфесіі айцец Аляксандр і каталіцкай — ксёндз Пётр.

Нагадаю, сёлета на Міншчыне мяркуецца сабраць 2,2 млн тон зерня з улікам кукурузы. Пасяўная плошча збожжавых і зернебабовых культур складае 602,7 тыс. гектараў.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

■ Надвор'е

# У НЯДЗЕЛЮ — МОЦНЫ ДОЖДЖ І ГРАД

**Напрыканцы тыдня ўмовы надвор'я на тэрыторыі Беларусі па-ранейшаму будзе вызначаць цёплая і вільготная паветраная маса, паведамілі ў Рэспубліканскім гідраметцэнтры Мінпрыроды.**

Таму сёння чакаецца пераменная воблачнасць. Раніцай пераважна без ападкаў, а днём у асобных раёнах пройдуць кароткачасовыя дажджы, прагрымяць навальніцы. Вецер паўночны ўмераны, пры навальніцах парывісты. Максімальная тэмпература паветра ўдзень плюс 23-29 градусаў, па паўднёвым усходзе месцамі яно прагрэецца да 30 цяпла. Атмасферны ціск істотна не зменіцца.

Захаваецца цёплае надвор'е ў нас і ў выхадныя, калі тэрыторыя краіны трапіць у зону цёплай няўстойлівай паветранай масы, а 20 ліпеня на ўсходзе Беларусі пачне гаспадарыць атмасферны фронт. У сувязі з гэтым у ноч на суботу будзе пераважна без ападкаў, а ўдзень месцамі па паўночна-ўсходняй палове пройдуць кароткачасовыя дажджы (магчыма, навальніцы).

СТАР. 2

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ



### НАРВЕГІЯ МОЖА ПЕРШАЙ У СВЕЦЕ АДМОВІЦЦА АД НАЯЎНЫХ ГРОШАЙ

Наяўныя грошы могуць быць выведзены з ужытку на тэрыторыі Нарвегіі ўжо да 2020 года. З такой прапановай выступіла нарвежская арганізацыя Finans Norge, якая аб'ядноўвае найбуйнейшыя банкі і страхавыя кампаніі краіны. «Мы выступаем за тое, каб Нарвегія ўжо ў 2020 годзе стала першай краінай у свеце, якая цалкам адмовілася ад наяўных грошай. Іх вывад з абарачэння ў першую чаргу дазволіць істотна знізіць колькасць рабаванняў, — заявіў дырэктар арганізацыі Ідар Кройцар. — Па-другое, адмова ад наяўных грошай дазволіць уладам больш эфектыўна змагацца з фінансавымі злачынствамі, бо электронныя плацяжы адсачыць нашмат прасцей, чым патокі наяўных. Нарэшце, па-трэцяе, грамадства ў цэлым істотна на гэтым сэканоміць, бо апрацоўка аперацый з наяўнымі абыходзіцца ўдвая даражэй». Паводле звестак арганізацыі, з кожным годам нарвежцы ўсё менш і менш карыстаюцца папяровымі купюрамі і манетамі. Сёння разлікі наяўнымі складаюць не больш за 5% усіх фінансавых аперацый (у зоне еўра — 9%, у ЗША — 7%).

### КІТАЙСКІХ ЧЫНОЎНІКАЎ ВЫРАШЫЛІ ЗВАЛЬНЯЦЬ ЗА ШЛЮБНУЮ НЯВЕРНАСЦЬ



У Кітаі чыноўнікаў, якіх выкрыюць у шлюбнай здрадзе, будуць звальняць з працы і выключаць з Камуністычнай партыі. Сачыць за паводзінамі дзяржслужачых даручылі Цэнтральнай камісіі КПК па праверцы дысцыпліны. Пра гэта паведамляе China Daily. Прычым робіцца гэта ў якасці сродку барацьбы з карупцыяй. Для таго, каб утрымліваць палюбоўніц, многія кітайскія чыноўнікі бяруць хабар, адзначае выданне. У інтэрнэт рэгулярна трапляюць відэа з партыйнымі чыноўнікамі і іх палюбоўніцамі. Звычайна пасля расстання іх выкладваюць у сеціва самі жанчыны. Тым самым яны дапамагаюць паліцыі выкрыць карумпаваных прадстаўнікоў улады.

ISSN 1990 - 763X
14133
9 771990 763008

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### РАЗВОДЫ ЧАСЦЕЙ ЗДАРАЮЦЦА Ў СЕМ'ЯХ З ДОЧКАМІ



Звесткі пра тое, што пары з дочкамі часцей разводзяцца, наводзілі многіх даследчыкаў на думку, быццам самі дзяўчынкі правакуюць развод бацькоў. Аднак прычына можа быць зусім не ў гэтым, паведамляе News Medical.net. Вынікі даследавання Універсітэта Дзюка паказваюць: дзяўчынкі могуць быць больш цягавітымі, чым хлопчыкі, на стадыі ўнутрывантробнага развіцця. «Дзяўчынкі здольны выжываць у стрэсавых сітуацыях, выкліканых канфліктамі ў сям'і, у якіх хлопчыкі не ў стане выжыць. Такім чынам, дзяўчынкі часцей нараджаюцца ў шлюбах, якія ўжо далі трэшчыну», — гаворыцца ў справаздачы. Раней навукоўцы лічылі, што мужчыны больш любяць сыноў, таму яны часцей сыходзяць з сем'яў, калі нараджаецца дачка.

КОРАТКА

У лясным фондзе Міністэрства лясной гаспадаркі суцэльнай санітарнай высечцы ў выніку моцнага ветру падлягае 54,52 тыс. куб.м драўніны на 202,7 га.

У маі доля работнікаў з зарплатай ніжэйшай за Br2 млн склала 6,5% ад усёй колькасці ў абследаваных арганізацыях, а ўдзельная вага работнікаў з зарплатай вышэйшай за Br10 млн — 7,8 %.

Служба занятасці Беларусі ў студзені—чэрвені гэтага года аказала садзейнічанне ў перасяленні на новае месца жыхарства і работы 142 сем'ям беспрацоўных.

«Белпошта» ў Мінску на Адзінцова, 36/1 адкрыла спецыяльны пункт па выдачы міжнародных паштовых адпраўленняў.

Чэмпіён свету па футболе, зборная Германіі, узначаліла рэйтынг ФІФА, другое месца ў аргенцінцаў, трэцяе — у зборнай Нідэрландаў. У дзясятцы таксама каманды Калумбіі, Бельгіі, Уругвая, Бразіліі, Іспаніі, Швейцарыі, Францыі. Зборная Беларусі, не правёўшы за мінулы месяц ніводнага матча, паднялася з 82-га месца на 81-е.

■ Ці чулі?

# БІБЛІЯТЭКА — СЯРОД ЛЕПШЫХ

## Беларуская «нацыяналка» патрапіла ў рэйтынг самых прыгожых бібліятэк свету

**Нацыянальная бібліятэка Беларусі з часу сваёй пабудовы паспела стаць адным з галоўных сімвалаў нашай сталіцы, хоць стаўленне да гэтага будынка ў розных спецыялістаў не заўжды было адназначным. Зрэшты, у замежнікаў беларускі храм кнігі звычайна выклікае добрыя ўражанні. Нядаўна блогеры з партала Urban Times уключылі беларускую «нацыяналку» ў спіс 28 самых прыгожых бібліятэк у свеце. Там яна апынулася побач з такімі будынкамі, як Ватыканская апостальская бібліятэка, бібліятэка парламента Нідэрландаў, гарадская бібліятэка Штутгарта і іншымі. Карэспандэнт «Звязды» звязаўся з аўтарам гэтага матэрыялу і даведаўся, чым Нацыянальная бібліятэка Беларусі ўразіла блогераў.**



— У Беларусі я ніколі не была і бібліятэку «ўжывую» не бачыла, — расказвае **блогер Urban Times Раеса МУКТА.** — Калі рыхтавала свой рэйтынг, выпадкова патрапіла на фотаздымкі Нацыянальнай бібліятэкі ў Беларусі. Мая мэта — паказаць, што бібліятэкі могуць быць незвычайнымі як знутры, так і звонку. І мне падалося, што будынак у Мінску абсалютна адпавядае гэтаму крытэрыю, бо ён сапраўды ўнікальны.

СТАР. 2

# ЗАДАННЕ НА ЗАЎТРА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Галоўным партнёрам нашай краіны ва ўсіх адносінах застаецца Расія. Стратэгічна важным Прэзідэнт лічыць супрацоўніцтва з Кітаем, дзе варта пераходзіць ад крэдытнага да інвестыцыйнага ўзаемадзеяння. Вялікія магчымасці адкрываюцца пасля падпісання дагавора аб стварэнні ЕАЭС. Кіраўнік дзяржавы лічыць неабходным замацаваць зрухі ў супрацоўніцтве з краінамі Еўропы, якія намеціліся ў апошнія два гады. «Еўропа была і застаецца для Беларусі адным з найважнейшых кірункаў развіцця гандлёва-эканамічных сувязяў і галоўнай крыніцай тэхналогій і абсталявання», — падкрэсліў беларускі лідар. Паводле слоў Прэзідэнта, Беларусь будзе актыўна працаваць на рынку Украіны. «І якія б там ні адбываліся падзеі ў сувязі з пагадненнем аб асацыяцыі з Еўрасаюзам і іншае, прагматызм украінцаў быў заўсёды, і яны нікуды не падзенуцца ад супрацоўніцтва з Еўразійскім эканамічным саюзам», — лічыць кіраўнік беларускай дзяржавы.

Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка патрабуе ад дыпламатаў шукаць перспектыўных партнёраў у розных рэгіёнах свету, каб развіваць супрацоўніцтва па аналогіі з тым, як Беларусь пабудавала сваё супрацоўніцтва з Венесуэлай у Лацінскай Амерыцы.

На сусветным рынку беларускім экспарцёрам даводзіцца канкурыраваць з вядучымі замежнымі кампаніямі і транснацыянальнымі карпарацыямі. «Значыць, трэба шукаць свае нішы, дзе беларуская прадукцыя была б запатрабавана», — заўважыў Прэзідэнт. Па словах кіраўніка дзяржавы, сучасная беларуская знешняя палітыка павінна з'яўляцца прамым увасабленнем формулы: «Дыпламатыя — гэта мастацтва магчымага». «Але не ў сэнсе «спачываць на лаўрах» ці «спаць у шапку», апраўдваючыся знешнімі неспрыяльнымі ўмовамі. Неабходна ставіць максімальныя мэты, прычым на ўсіх кірунках. І толькі тады можна разлічваць на нейкі прымальны вынік», — упэўнены Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт даручыў ураду і Міністэрству замежных спраў вывучыць эфектыўнасць работы дылерскай сеткі беларускіх прадпрыемстваў за мяжой. Паводле слоў Прэзідэнта, наспела неабходнасць аптымізацыі тавараправоднай сеткі і замены, калі гэта неабходна, нядбайных дылераў, стварэння паміж імі канкурэнцыі. Аляксандр Лукашэнка таксама адзначыў, што сістэмнага падыходу патрабуе і стварэнне знешнеэканамічнай інфраструктуры пад беларускі экспарт.

«Ва ўрада, органаў дзяржкіравання, МЗС, замежных устаноў задача адна — у самыя кароткія тэрміны аднавіць пазіцыі на традыцыйных рынках, нарасціць пастаўкі нашай прадукцыі на новыя перспектыўныя гандлёвыя пляцоўкі і да канца года забяспечыць выкананне ўстаноўленых паказчыкаў знешняга гандлю. Гэта патрабаванне часу», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

**Паводле БЕЛТА.**

УНП 101015738

**РУП «Белпочта»**
**ОБЪЯВЛЯЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПЕРЕГОВОРОВ**
**по выбору инженерной организации для выполнения работ по осуществлению технического надзора на объекте «Устройство узла учёта системы отопления и горячего водоснабжения и автоматического регулирования системы отопления на объекте: РУП «Белпочта», отделение почтовой связи №75 по ул. Бачило, 14 в г. Минске».**

Процедура переговоров состоится **24 июля 2014 года в 10.00 по адресу: г. Минск, пр. Независимости, 10.**
Контакты для получения дополнительной информации:
отдел капитального строительства – тел.: 293-55-29, 293-55-28.

## ЗАО «ИнтерПэйБанк»

www.ipaybank.by

ул. Некрасова, 114, г. Минск, 220068, Республика Беларусь
Телефон: +375 17 287 83 21

### БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 июля 2014 г.

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 2014 год | 2013 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | | 15 659 | 12 061 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | | 10 | 10 |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | | 558 | 5 142 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | | 3 573 | 39 280 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | | 181 450 | 183 760 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | | 29 457 | 37 313 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | | - | - |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | | - | - |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | | 19 618 | 20 320 |
| 11 | Имущество, предназначенное для продажи | 1110 | | - | - |
| 12 | Отложенные налоговые активы | 1111 | | - | - |
| 13 | Прочие активы | 1112 | | 7 806 | 6 898 |
| 14 | ИТОГО активы | 11 | | 258 131 | 304 784 |
| 15 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | | |
| 16 | Средства Национального банка | 1201 | | - | - |
| 17 | Средства банков | 1202 | | 19 944 | 54 397 |
| 18 | Средства клиентов | 1203 | | 24 732 | 28 853 |
| 19 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | | - | 22 436 |
| 20 | Производные финансовые обязательства | 1205 | | - | - |
| 21 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | | - | - |
| 22 | Прочие обязательства | 1207 | | 2 932 | 2 221 |
| 23 | ВСЕГО обязательства | 120 | | 47 608 | 107 907 |
| 24 | **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | | |
| 25 | Уставный фонд | 1211 | | 150 394 | 150 394 |
| 26 | Эмиссионный доход | 1212 | | 1 | 1 |
| 27 | Резервный фонд | 1213 | | 8 841 | 8 241 |
| 28 | Фонды переоценки статей баланса | 1214 | | 13 799 | 14 360 |
| 29 | Накопленная прибыль | 1215 | | 37 488 | 23 881 |
| 30 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | | 210 523 | 196 877 |
| 31 | ИТОГО обязательства и собственный капитал | 12 | | 258 131 | 304 784 |

### ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ на 1 июля 2014 г.

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 2014 год | 2013 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | | 8 442 | 9 134 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | | 2 793 | 2 904 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | | 5 649 | 6 230 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | | 18 440 | 9 685 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | | 1 501 | 1 041 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | | 16 939 | 8 644 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | | | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | | 379 | (2208) |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | | 13 130 | 6499 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | | (-15) | (5) |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | | 9 002 | 1443 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | | 3 137 | 6 476 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | | 27 204 | 21 175 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | | 692 | 1 596 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | | 2 321 | 1 422 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | | 1 848 | 613 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | | 473 | 809 |

**Руководитель** **О.В. Земнов**

**И.о. главного бухгалтера** **Л.Н. Брухнова**

**Дата подписания «7» июля 2014 г.**

Лицензия Национального банка Республики Беларусь на осуществление банковской деятельности № 19 от 03 июня 2013 года. УНП 807000030.

■ Да ўвагі вытворцаў

# ДЛЯ ПАВЫШЭННЯ КАНКУРЭНТАЗДОЛЬНАСЦІ І ІМІДЖУ

## Абвешчаны чарговы, пяты конкурс на суісканне прэміі СНД 2015 за дасягненні ў галіне якасці

**Гэты конкурс, які каардынуе Міждзяржаўны савет па стандартызацыі, метралогіі і сертыфікацыі (МДС) краін СНД, праводзіцца, пачынаючы з 2006 года. Як кажуць самі арганізатары, яго задачамі з'яўляюцца стымуляванне выпуску высакаякаснай і канкурэнтаздольнай прадукцыі і паслуг, садзейнічанне развіццю экспартнага патэнцыялу прадпрыемстваў, прымяненню імі сучасных метадаў і інструментаў менеджменту, а таксама задавальненню запытаў спажыўцоў.**

Прэтэндаваць на прэмію за якасць могуць юрыдычныя асобы любой арганізацыйна-прававой формы, зарэгістраваныя ў любой дзяржаве, якая з'яўляецца ўдзельніцай СНД, і ажыццяўляюць вытворчасць прадукцыі (акрамя вытворчасці ўзбраення і ваеннай тэхнікі) або аказваюць паслугі. Пры гэтым прадпрыемства павінна мець пацвярджэнне высокай якасці выпускаемай прадукцыі або аказваемай паслугі на працягу не менш за два гады і экспартаваць прадукцыю (паслугі) не менш чым у дзве дзяржавы — удзельніцы СНД.

Конкурс праводзіцца ў два этапы. На першым — рэспубліканскім — ажыццяўляецца ацэнка прэтэндэнтаў нацыянальнымі органамі па стандартызацыі, метралогіі і сертыфікацыі дзяржаў — удзельніц СНД па ўстаноўленым крытэрыям прэміі і вызначаюцца ўдзельнікі наступнага этапу.

Для правядзення другога этапу МДС фарміруе журы конкурсу, сцвярджае склад экспертных камісій з ліку экспертаў дзяржаў — удзельніц СНД.

У аснове ацэнкі канкурсантаў ляжаць крытэрыі Еўрапейскага фонду менеджменту якасці (EFQM).

Рашэнне аб прысуджэнні прэміі прымаецца Эканамічным саветам СНД.

«Перамога ў такім прэстыжным конкурсе — гэта падзея для прадпрыемства, падзея для рэспублікі, і мы спадзяёмся, што развіццё эканомік нашых дзяржаў будзе адбывацца ў тым ліку з дапамогай такіх конкурсаў», — лічыць дырэктар Бюро па стандартах — адказны сакратар МДС Мікалай Сонец.

Пра адчувальную карысць удзелу ў конкурсе кажуць і самі прадпрыемствы. Для іх гэта рэальная магчымасць аб'ектыўна ацаніць сваю дзейнасць, вызначыць найбольш слабыя месцы, каб у будучым узмацніць свае канкурэнтныя пазіцыі на ўнутраным і знешнім рынках.

Такім чынам, пяты конкурс за лепшую якасць у краінах Садружнасці ўжо стартаваў: беларускія прадпрыемствы могуць накіроўваць заяўкі на ўдзел да 1 кастрычніка 2014 года ў сакратарыят камісіі пры Дзяржстандарце Рэспублікі Беларусь.

Пераможцы будуць названы ў канцы 2015 года.

Лаўрэатам, дыпламантам, а таксама арганізацыям — уладальнікам спецыяльнага прыза «Прызнанне дзелавой дасканаласці» будуць уручаны дыпломы і прызы. Інфармацыя аб пераможцах будзе ўключана ў ілюстраваны каталог «Прэмія СНД 2015 года» і размешчана на інтэрнэт-сайтах МДС і Дзяржстандарта Рэспублікі Беларусь. Акрамя гэтага, лаўрэаты і дыпламанты атрымаюць права выкарыстання эмблемы Прэміі СНД у рэкламных мэтах на працягу трох гадоў.

Дарэчы, айчынныя прадпрыемствы прымалі ўдзел ва ўсіх чатырох праведзеных конкурсах. І ў кожным з іх былі ўдастоены найвышэйшых узнагарод. Напрыклад, у 2013 годзе лаўрэатамі і дыпламантамі сталі шэсць беларускіх прадпрыемстваў, пацвердзіўшы сваю прыхільнасць якасці. Гэта ВА «Гомсельмаш», ААТ «Бабуліна крынка» — кіруючая кампанія холдынга «Магілёўская малочная кампанія «Бабуліна крынка», ААТ «Краснасельскбудматэрыялы», сумеснае таварыства з абмежаванай адказнасцю «Контэ Спа» (г. Гродна), ААТ «Рагачоўскі малочнакансервавы камбінат», Рэспубліканскі навукова-практычны цэнтр радыяцыйнай медыцыны і экалогіі чалавека (г. Гомель).

Усяго за час правядзення конкурсаў у лік пераможцаў увайшло 18 айчынных арганізацый.

**Дар'я ШОЦІК**

■

# У НЯДЗЕЛЮ — МОЦНЫ ДОЖДЖ І ГРАД

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Вецер паўночны слабы, пры навальніцах парывісты. Тэмпература паветра ноччу знізіцца да плюс 12-19 градусаў, а ўдзень стане плюс 23-28, па поўдні месцамі да 30 цяпла.

У нядзелю пераважна па ўсходняй палове чакаюцца кароткачасовыя дажджы. Месцамі моцныя дажджы, навальніцы, днём магчымы град. Вецер паўночна-ўсходні слабы, пры навальніцах парывісты. Уначы будзе плюс 12-19 градусаў, максімальная тэмпература ўдзень — 22-28 цяпла, па поўдні месцамі да плюс 30 градусаў.

Паводле доўгатэрміновых прагнозаў, у панядзелак уплыў франтальнага падзелу распаўсюдзіцца з усходу на большую частку тэрыторыі краіны і ў многіх раёнах пройдуць кароткачасовыя дажджы, месцамі з навальніцамі. Магчымы моцныя ліўні. Днём у асобных раёнах град. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 12-19 градусаў, днём прагназуецца ад плюс 21 па паўночным усходзе да 30 градусаў цяпла па паўднёвым захадзе краіны. У сярэдзіне наступнага тыдня атмасферны ціск павысіцца і дажджоў стане менш.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# БІБЛІЯТЭКА — СЯРОД ЛЕПШЫХ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

**— А што ў беларускай бібліятэцы ўразіла вас найбольш?**

— Яна выглядае вельмі сучасна. Акрамя таго, мае такую незвычайную форму. Часцей за ўсё ўстановы такога кшталту выглядаюць больш традыцыйна. Мне здаецца, што бібліятэкі з цягам часу ўсё менш і менш пачынаюць звязваць з кнігамі. Цяпер зручна працаваць з дакументамі і іншай інфармацыяй у лічбавым фармаце, а таму і эстэтычны аспект выходзіць на першы план. Людзям больш падабаецца працаваць і вучыцца там, дзе прыгожа, дзе ёсць увесь неабходны функцыянал. Я таксама ўздымаю тэму таго, што людзі ўсё менш карыстаюцца бібліятэкамі, не цікавяцца кнігамі. У Лондане шматлюдна толькі ў Брытанскай бібліятэцы і бібліятэцы Сената — вельмі прыгожых будынках, дзе знаходзяцца рэдкія кнігі і дакументы. Думаю, што ў Беларусі прыкладна такая ж сітуацыя.

**— Нядаўна іншы беларускі архітэктурны аб'ект патрапіў у падобны рэйтынг, толькі са знакам «мінус». Тэлеканал CNN уключыў у спіс самых непрыгожых помнікаў манумент «Мужнасць», які знаходзіцца ў Брэсцкай крэпасці, хоць пасля і папрасіў прабачэння...**

— Калі я ўпершыню ўбачыла гэты помнік, мне здалося, што ён сімвалізуе моц і гераізм. Думаю, што такая вялікая кампанія, як CNN, павяла сябе па-журналісцку некарэктна, калі вырашыла скласці такі спіс. Бо я ўпэўнена, што кожнаму чалавеку могуць падабацца і не падабацца розныя рэчы, — гэта справа густу. Але густ — не нагода ганьбіць чужыя каштоўнасці.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**

# КАЛІ РЭКІ БЫЛІ... ТРАСАМІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

## А ЦІ ІСНАВАЎ ЗНАКАМІТЫ ШЛЯХ?

Не ўсе гісторыкі пагаджаюцца з існаваннем знакамітага воднага шляху «з варагаў у грэкі», частка якога праходзіла па Заходняй Дзвіне. Кажуць, што былі іншыя шляхі — больш зручныя і параўнальна кароткія. Іх існаванне пацвярджаюць розныя крыніцы, чаго нельга сказаць пра згаданы ў летапісе толькі аднойчы шлях «з варагаў у грэкі».

— Пра рэальнае існаванне шляху «з варагаў у грэкі» многія навукоўцы спрачаюцца. Таму што яго апісанне ў летапісе не зусім дакладнае: пачынаецца на Дняпры і ідзе па Волхаве. Але Дзвіна пры гэтым не згадваецца? Хаця абмінуць яе нельга. У ранніх крыніцах няма ніякіх згадак пра выкарыстанне самой Заходняй Дзвіны для плавання да Балтыкі. Тым не менш пра тое, што гэты шлях мог выкарыстоўвацца, сведчаць, напрыклад, знаходкі скарбаў таго перыяду, якія сустракаюцца ўздоўж Дзвіны. На жаль, менш вядомы на Беларусі Волжскі гандлёвы шлях, адно з адгалінаванняў якога таксама праходзіла і праз тэрыторыю сучаснай Віцебшчыны, — расказвае **Дзяніс ЮРЧАК, намеснік дэкана па вучэбнай рабоце гістарычнага факультэта Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П.М. Машэрава.**

Мы сустрэліся з Дзянісам Валер'евічам у Віцебскім раёне, недалёка ад месца, дзе будуецца ГЭС. Зразумела, што ў выніку запуску каскада ГЭС на адной з самых галоўных рэк Еўропы рэчышча назаўсёды зменіцца. Удзельнікі ж экспедыцыі гатовы супаставіць гістарычныя і геаграфічныя звесткі, зрабіць фота- і відэаздымку значных прыродных і гістарычных аб'ектаў. Гэта дасць унікальную магчымасць сабраць найбагацейшы матэрыял краязнаўчага характару і захаваць для будучых пакаленняў сучаснае аблічча Заходняй Дзвіны.

— Па ўчастку ракі, дзе цяпер будуецца ГЭС, падарожнічалі здаўна. Праўда, тут Заходняя Дзвіна мае парогі, што было небяспечна для тых, хто рухаўся па вадзе. І было нямала прыкладаў, калі караблі разбіваліся аб іх. Летась сам на Касплі сеў на мель пасярэдзіне ракі, калі плыў на гумавай лодцы. Аказалася, што глыбіня — 15 сантыметраў — максімум. Таму гандлёвыя шляхі ў перыяд нізкай вады, хутчэй за ўсё, не выкарыстоўваліся, — працягвае гісторык.

Паводле яго слоў, у мінулым менавіта водныя шляхі былі, як бы цяпер сказалі, трасамі міжнароднага прызначэння. Карысталіся імі і зімой: ездзілі на санях. Хадзілі і ўздоўж рэк, таму што берагі, на якіх не расце лес, вельмі зручныя для перасоўвання.

Вядома, водныя шляхі былі часта небяспечнымі: гандляроў рабавалі зладзеі...

— Мы з маім калегай Мікалаем Півоварам, кандыдатам гістарычных навук, дацэнтам, ужо зрабілі заяўку для падтрымкі рэалізацыі нашага праекта. Прычым рэалізаваць яго трэба своечасова. Да 2020 года на Віцебшчыне запланавана будаўніцтва чатырох ГЭС. Тую Заходнюю Дзвіну, якая ёсць сёння, згубім назаўсёды. Калі будзе створана вадасховішча, гэтых славутых парогаў, многіх выспаў і валуноў, якія падрабязна апісаў Сапуноў, больш не будзе, бо яны апынуцца пад вадой. Пакуль што ёсць магчымасць паўтарыць даследчы шлях Сапунова і зафіксаваць тое, што ёсць — сабраць дакументы для стварэння віртуальнага (а мо і не віртуальнага) музея ракі. Гэта, думаю, патрэбна і Віцебскаму раёну, кіраўніцтва якога працуе над тым, каб прыязджала больш турыстаў, — дзеліцца планамі Дзяніс Юрчак.

## ГІСТОРЫЯ Ў 3D-ФАРМАЦЕ

Старажытнасць у фармаце 3D — у гэтым кірунку ўжо многае зроблена студэнтамі Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П.М. Машэрава. Яны распрацоўваюць унікальны праект.

Ужо сёння на маніторы камп'ютара можна ўбачыць, што ўяўляла сабой балцкае гарадзішча на месцы сучаснага Віцебска ў старажытнасці. У хуткім часе, калі праект атрымае падтрымку, карыстальнікі інтэрнэту змогуць літаральна «пахадзіць» на першых пасяленнях на тэрыторыі сучаснай Беларусі, апынуцца ў гасцях у далёкіх продкаў, адправіцца ў харчэўню, убачыць штурм замка і многае іншае.

Працу студэнтаў можна выкарыстоўваць і ў выглядзе захапляльнай гульні. Тыя, хто цікавіцца гісторыяй, змогуць выбраць у якасці героя аднаго з жыхароў Прыдзвіння мінулага і кіраваць ім, напрыклад, у баях.

Праўда, рэалізуюць праект пакуль што на голым энтузіязме. Калі будуць прапановы, студэнты змогуць адрадзіць мінулае не толькі Віцебска, але і іншых населеных пунктаў Беларусі. Пры гэтым будзе гарантавана максімальная набліжанасць да мінулага нават у дробязях. Віртуальная «машына часу» дакладна з навуковага пункту гледжання. Пры яе дапамозе вывучэнне гісторыі стане захапляльнай і нескладанай нават для дзяцей.

Да таго ж «віртуальная старажытнасць» — безумоўна, добры спосаб рэкламаваць турыстычны патэнцыял Віцебшчыны. Студэнцкая ініцыятыва можа быць запатрабавана і ў якасці камерцыйнай рэкламы вытворцаў рэгіёна.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**



Віцебск у мінулым.

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

## МЯСА ЎЖО ТАННЕЕ

**Аператыўны маніторынг рознічнай гандлёвай сетцы ў ліпені сведчыць аб тэндэнцыі да зніжэння цэн на асобныя віды мяса (ялавічына, свініна, куры) і асобныя мясапрадукты, паведамляе прэс-служба беларускага ўрада.**

На зніжэнне цэн паўплывалі загады, прынятыя Дэпартаментам цанавой палітыкі Міністэрства эканомікі: накіраванне лістоў-папярэджанняў і выдача прадпісанняў асобным суб'ектам гаспадарання і дзяржаўным органам кіравання па спыненні парушэнняў антыманапольнага заканадаўства, што выразілася ў значным росце цэн на дадзеную прадукцыю.

Нагадаю, што на мінулым тыдні Мінэканомікі выдала прадпісанні Віцебскай бройлернай птушкафабрыцы, СТАА «Віткопрадукт», ААТ «Смалявічы Бройлер» і СЗАТ «Сервалюкс» (філіял «Сервалюкс Агра») знізіць цэны на паўфабрыкаты з мяса птушкі. Рашэнне было прынята ў сувязі з рэзкім павелічэннем адпускных цэн на гэтую прадукцыю ў маі. Адпаведныя прадпісанні атрымалі Брэсцкі, Гродзенскі аблвыканкамы і камітэт па сельскай гаспадарцы і харчаванні Мінскага аблвыканкама, якія павінны былі забяспечыць зніжэнне закупачных цэн на свіней і адпускных цэн на свініну і мясапрадукты. Дарэчы, гэтыя прадпісанні неабходна выканаць у поўным аб'ёме ў тэрмін да 21 ліпеня. Справа, здаецца, зрушылася з месца...

**Сяргей КУРКАЧ.**

## МОЛАДЗЬ — АПОРА ПРАВАСЛАЎЯ

**Фестываль праваслаўнай моладзі Мінскай епархіі адбудзецца ў Валожыне 18—20 ліпеня. Праграмай мерапрыемства прадугледжаны хрэсны ход. Вернікі пройдуць 38 кіламетраў па населеных пунктах раёна. Удзельнікаў чакае ўсяночнае богаслужэнне ў храме святых Канстанціна і Алены і на цэнтральнай плошчы горада, а таксама скрыпічнае шоу.**

Акрамя таго, арганізуюцца тэматычныя паказы фільмаў, выставы, майстар-класы, конкурсы і спартыўныя спаборніцтвы, выступленне байцоў спецназа. На духоўным форуме чакаюць вядомых беларускіх выканаўцаў: групу «Тяни-Толкай», Івана Буслая, дуэт Аляксандра Цікановіча і Ядзвігі Паплаўскай.

Падчас фестывалю будуць працаваць горад майстроў і дзіцячыя атракцыёны, прадавацца сувенірная прадукцыя.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

## ПЕРШАЯ ЗАПРАЎКА ДЛЯ ЭЛЕКТРАМАБІЛЯЎ З'ЯВІЦЦА Ў МІНСКУ

**У Мінску з'явіцца спецыяльная запраўка для электрамабіляў, дзе зарадзіць аўто можна будзе ў разы хутчэй. Як паведаміў карэспандэнту агенцтва «Мінск — Навіны» старшыня праўлення групы кампаній «А-100» Аляксандр Ценцер, у сталіцу ўжо прыбыло абсталяванне і спецыялісты займаюцца яго ўстаноўкай.**

— Сёння падзарадзіць аўто можна на любой запраўцы. Іншая справа, што на гэта спатрэбіцца 7-8 гадзін, — адзначыў А. Ценцер. — Наш праект спецыяльнай запраўкі для электрамабіляў унікальны тым, што тут на поўную зарадку патрабуецца ўсяго паўгадзіны. Пакуль плануецца запусціць усяго адзін такі пункт, паколькі электрамабіляў у Мінску яшчэ не вельмі шмат.

**Дар'я АРОЛ, «Мінск — Навіны».**

■ Меркаванне эксперта



# НАРАСЦІЦЬ ВАГУ

## Якімі павінны быць прынцыпы еўразійскага саюзнага будаўніцтва

**Сусветны эканамічны крызіс паступова змяняе светапогляд нацыянальных эліт. На нашых вачах ЗША пераходзяць да самамабілізацыі: здабыча ўласнай нафты і газу перавысіла ўжо расійскі ўзровень, шматлікія прамысловыя прадпрыемствы вяртаюцца з Паўднёва-Усходняй Азіі, імкліва нарошчваецца экспарт — у 2009 годзе ён складаў 1,58 трыльёна долараў, а ў 2013-м дасягнуў 2,28 трыльёна. Курс на рэіндустрыялізацыю Еўрапейскага саюза абвясціў днямі новы прэзідэнт Еўракамісіі Жан-Клод Юнкер, заявіўшы пра пачатак праграмы інвеставання 300 мільярдаў еўра.**

**На гэтым фоне адбылося падпісанне дагавора аб стварэнні Еўразійскага эканамічнага саюза. На парадку дня — насычэнне дакумента эфектыўнай мабілізацыяй рэсурсаў і магчымасцяў краін — удзельніц ЕАЭС, нарошчванне эканамічнай, палітычнай і ваеннай вагі новага аб'яднання. Сёння сукупны валавы ўнутраны прадукт Еўразійскага саюза не дасягае нават 3% ад сусветнага ВУП, тады як у 1990 г. ВУП СССР складаў 14%.**

Вярнуць страчаныя пазіцыі можна толькі дзякуючы напружанай працы, шляхам мадэрнізацыі і рэіндустрыялізацыі еўразійскай прасторы. Беларусь павінна адыграць у гэтых працэсах ключавую ролю, бо яна яшчэ ў сярэдзіне 1990-х гадоў абачліва абрала захаванне і развіццё сваіх індустрыяльных магутнасцяў, прычым у шчыльным эканамічным саюзе з Расіяй. Вынікі гэтага гістарычнага выбару мы назіраем па кантрасце з суседнімі краінамі, дзе палеткі зарастаюць хмызняком, былыя заводы нагадваюць дэкарацыі да фільмаў жахаў, а паспешлівыя спадзяванкі на эканоміку паслуг не спраўдзіліся.

Перш чым прыступаць да рэіндустрыялізацыі эканомікі Расіі і Казахстана, варта зразумець, што прывяло да драматычнай дэградацыі іх шматгаліновай эканомікі ў 1990-я гады. Тады ўрады гэтых краін зрабілі стаўку на развіццё сыравінных галін і занядбалі ўсе астатнія. Сакрэт жа савецкага імклівага эканамічнага росту заключаўся ў існаванні перакрыжаванага субсідавання — калі частка звышдаходаў ад прыроднай рэнты накіроўвалася на будаўніцтва і падтрымку шматлікіх заводаў, сельгаспрадпрыемстваў, навукова-даследчых устаноў. Гэта было асэнсаванае рашэнне, альтэрнатывы якому для поўначы кантынента проста не існуе: суровы і непрадказальны клімат робіць стратнымі агракомплекс і будаўнітва, а велізарныя малазаселеныя абшары патрабуюць каласальных укладанняў у інфраструктуру.

Рэфарматары 1990-х прарочылі фантастычнае ўзбагачэнне Расіі, Казахстана і іншых рэспублік, багатых на карысныя выкапні, пасля ўвядзення сусветных цэн на сыравіну, экспарцёрамі якой яны з'яўляюцца. Але эфект атрымаўся адваротным. Разбурэнне механізма ўнутрысаюзных цэн, дзе сыравінныя галіны сілкавалі ўсю эканоміку, прывяло да эканамічнай катастрофы — перадусім для Расіі, дзе былі знішчаны тысячы прадпрыемстваў і ўнікальных тэхналогій, зруйнаваны цэлыя галіны эканомікі: ад жывёлагадоўлі да станкабудаўніцтва. Але галоўнае — адбылося нечуванае маёмаснае расслаенне грамадства: 0,2% сем'яў захапілі 70% нацыянальнага багацця, а найчасцейшы (медыянны) даход звычайных грамадзян аказаўся ніжэйшым за беларускія паказчыкі (дзе доля сыравіны ў эканоміцы нязначная), паводле звестак інстытута Гэлапа.

**Сёння імпарт Беларусі ў Расію складае 16 млрд долараў, і гэты паказчык патэнцыйна можна ўзняць у два і нават тры разы.**

Выправіць згаданыя перакосы можна з дапамогай Еўразійскага эканамічнага саюза, але пры ўмове аднаўлення міжгаліновага субсідавання і стварэння роўных умоў для прадпрыемстваў з усіх краін-саюзніц. На жаль, заключаны дагавор адкладае стварэнне агульнага і раўнапраўнага рынку энерганосьбітаў яшчэ на 10 гадоў — да 2025 года. Больш за тое, абмежаванні на тавараразварот накладзены на 900 таварных пазіцый. Нягледзячы на павольнасць інтэграцыі, планаваць працу ў новых умовах трэба ўжо цяпер.

І адной з галоўных задач будзе імпартазамяшчэнне. Асабліва гэта тычыцца расійскага рынку, які імпартуе розных тавараў з-за межаў Еўразійскага саюза на 500 млрд долараў, хоць значная частка гэтага аб'ёму можа выпрабляцца ў Беларусі, Казахстане і Расіі. Сёння імпарт Беларусі ў Расію складае 16 млрд долараў, і гэты паказчык патэнцыйна можна ўзняць у два і нават тры разы.

Адказ на пытанне, што выпрабляць, а што імпартаваць у Еўразійскім саюзе, павінны даваць эканамічныя спецыялісты, ствараючы міжгаліновыя балансы і стратэгічныя планы развіцця паўночнай Еўразіі. Але тут нельга кіравацца выключна логікай максімізацыі прыбытку: маўляў, калі нерэнтабельна, то не выпрабляем. Ёсць яшчэ шмат прычын, якія ўплываюць на дылему «выпрабляць ці імпартаваць».

Напрыклад, асаблівыя патрабаванні да якасці тавараў. Добра вядомая сітуацыя, калі Украіна да футбольнага Еўра-2012 закупіла электрычкі, адкінуўшы прапановы ўласных вытворцаў і абраўшы найбольш танныя карэйскія цягнікі. У выніку непрыстасаваныя да ўкраінскага клімату электрычкі сталі героямі народных анекдотаў праз свае шматлікія паломкі. У якасці супрацьлеглага прыкладу можна прывесці беларускі падыход: швейцарская фірма «Штадлер» паставіла нам некалькі электрычак і ўзяла на сябе абавязацельствы запусціць сумесную вытворчасць цягнікоў у Фаніпалі.

Акрамя таго, трэба ўлічваць пытанні нацыянальнай бяспекі. Кожная краіна, згодна з рэкамендацыямі ФАО (харчовая і сельскагаспадарчая арганізацыя ААН), павінна забяспечваць уласную харчовую бяспеку, нават калі гэта і нерэнтабельна. Варта таксама памятаць пра сацыяльную стабільнасць: закрыццё вялізных прадпрыемстваў генерыруе тысячы беспрацоўных, стымулюе ўцёкі кваліфікаванай працоўнай сілы і яе замяшчэнне нелегальнымі мігрантамі з бедных і крымінальных краін. Для Беларусі, як індустрыяльнага аазіса Усходняй Еўропы, надзвычай важнае значэнне маюць тэхналагічная незалежнасць, праца ўласнага ваенна-прамысловага комплексу, эфектыўнае выкарыстанне наяўных вытворчых магутнасцяў, іх своечасовая мадэрнізацыя згодна з навукова-тэхнічным прагрэсам і г.д.

Усе гэтыя фактары трэба браць пад увагу для таго, каб стварыць збалансаваную эканоміку Еўразійскага эканамічнага саюза, вярнуць нашым краінам належную эканамічную і палітычную вагу ў свеце і перайсці да наступнага кроку — рэалізацыі праекта «інтэграцыі інтэграцый» ад Лісабона да Уладзівостока, які прапанаваў у 2011 годзе Прэзідэнт Беларусі.

**Аляксандр СІНКЕВІЧ, эканамічны аглядальнік**

■

■ У ракурсе

# ПРА ГОРАД І ДЛЯ ГОРАДА

## Тэлевізійнікі з Барысава імкнуцца зрабіць усё, каб людзі ганарыліся сваёй малой радзімай

**Тэлеканал «Святло ТБ» пачаў існаваць у Барысаве вясной 2008 года. І за гэты час ужо не аднойчы звяртаў на сябе ўвагу тэлевізійнай супольнасці. У 2011 годзе тут арганізавалі міжнародны тэлемост, прысвечаны Дню Вялікай Перамогі, які аб'яднаў сяброў-франтавікоў з Беларусі, Расіі і Украіны. А праграма была адзначана на конкурсе «Тэлевяршыня» дыпломам 3-й ступені ў намінацыі «Лепшы рэгіянальны праект года». Праз два гады праект «Бярэзіна-1812» здабыў сваю ўзнагароду ў той жа намінацыі — 2-е месца. А сёлета на Х юбілейным конкурсе тэлевізійнікаў быў адзначаны праект «Беларусь самабытная». Мы завіталі ў госці на «Святло ТБ» і сустрэліся з галоўным рэдактарам Сяргеем БЯЛЕЦКІМ і яго наменснікам, а таксама аўтарам сцэнарыя, пастаноўшчыкам і вядучай тэлепраектаў «Бярэзіна-1812» і «Беларусь самабытная» Святланай ЧАКАЛАВАЙ, каб даведацца пра тэлевізійнае жыццё знутры.**


Стаўшы лаўрэатам «Тэлевяршыні-2014», каманда «Святло ТБ» на дасягнутым не спыняецца.

**— Чым жыве сёння рэгіянальнае тэлебачанне?**

***С.Б.:*** Правільна было б сказаць, што рэгіянальнае тэлебачанне, калі хоча мець сваю аўдыторыю, павінна жыць інтарэсамі гледачоў. Наогул, такі мой пункт гледжання, і сусветнай практыкай ён пацверджаны, што тэлебачанне ў рэгіёне — пра горад і для горада. Нават калі ў праграме асвятляецца нейкая падзея сусветнага маштабу, то паказваць яе трэба праз прызму таго, як яна паўплывае на кожнага жыхара вашай мясцовасці. Безумоўна, пытанняў рэспубліканскага ўзроўню мы не вырашаем, але наша мэта і важнейшая задача — каб гледачу было цікава. Будзе тут інтарэс — зможаце прывабіць рэкламадаўцу. А ў сукупнасці канал зможа быць не толькі іміджавым праектам, але і прыбытковым. І гэта дасць магчымасць развівацца.

**— Улічваючы развіццё інтэрнэту, ці складана быць канкурэнтаздольнымі?**

***С.Б.:*** Акрамя падзей у свеце, людзей хвалюе перш за ўсё тое, што адбываецца з суседзямі. Таму рэгіянальны канал нельга замяніць ніводным цэнтральным. Незалежна ад таго, дзе мы знаходзімся, заўсёды цікава мець магчымасць даведацца пра навіны ў родным горадзе, нават калі такая патрэба ўзнікае час ад часу. Таму мы арганізоўвалі трансляцыю ў інтэрнэце амаль з першых дзён існавання. Нас глядзяць многія, і з пазіцыі, скажам так, «местачковасці» — мы па-за канкурэнцыяй. Наша аўдыторыя — гэта не толькі барысаўчане. Ёсць наведвальнікі і з-за мяжы, што ўдаецца адсочваць.

**— Як адчуваеце сябе ў ролі кіраўніка творчага калектыву?**

***С.Б.:*** У гэтай ролі я з 21 года і, мабыць, нават не ведаю сябе не ў ёй. Не істотна, колькі чалавек у падпарадкаванні — дзясятак альбо сотня. На мой погляд, больш творчых людзей, чым ваенныя, наогул складана знайсці. *(Усміхаецца).* Таму што для іх калі ставіцца задача, то яны гатовы шукаць і адкрываць у сабе розныя творчыя магчымасці, каб вырашыць яе. Тэлевізійнікам складана тварыць кожны дзень на ўсе сто працэнтаў, якім бы ні быў талент і патэнцыял. Гэтая праца, здараецца, «спальвае» людзей. Таму да іх трэба ставіцца беражліва і не імкнуцца нагрувашчваць увесь час задачамі, каб «зіхацелі». Трэба даваць магчымасць назапашваць сілы і для «зорнага часу». Аднак добрага выканання працы ніхто не адмяняе. Прыемна, што ўсе, хто працуе сёння на нашым тэлеканале, заўсёды з радасцю адклікаюцца на мае ідэі і гатовы творча падыходзіць да іх рэалізацыі, прапускаць праз сэрца. Тэлебачанне — гэта ж творчасць многіх. І калі кожны: карэспандэнт, аператар, відэаінжынер і іншыя — выконвае сваю працу добра, то маем выдатны вынік.

**— А маладыя кадры ў вас знаходзяць прытулак?**

***С.Б.:*** Не магу сказаць, быццам чарга выстройваецца з выпускнікоў творчых ВНУ, бо большасць усё ж імкнецца рэалізаваць сябе на цэнтральных каналах. Ёсць выпадкі, калі ў нас людзі набываюць добрую практыку, а потым заяўляюць аб сабе ў сталіцы. У асноўным мы нікому не адмаўляем, бо галоўнае правіла — не прапусціць «золата». Лепш ахвяраваць адной стаўкай, чым не разгледзець таленту і потым шкадаваць…

### НАСТАЛЬГІЯ

**5.00** «Уладзімір Этуш». 1993 год.
**5.45** «Магчыма ўсё». Музычная віктарына. 1993 год.
**6.20** Тэлефільм «Следства вядуць Знатакі».
**8.00, 2.00** «Мінулы час».
**9.00** «Колба часу». «Любімы від адпачынку ў СССР».
**10.00** «Кінапанарама». «Міжнародны кінафестываль у Рыміні». 2-я частка. 1990 год.
**11.00, 17.00** «КіВіН-90» Першы Усесаюзны фестываль каманд КВЗ у Днепрапятроўску. 1990 год.
**12.00, 18.10** «Песня-88».
**13.30** Дак. фільм «Сустрэчы з Яўгенам Еўсцігнеевым».
**15.00 Маст. фільм «Патрэбныя людзі».**
**16.30** «Давай пагаворым». Канцэртная праграма. 1991 год.
**19.25** «Пакуль усе дома». 1993 год.
**20.00 Маст. фільм «Усміхніся суседу».**
**21.00** «Тэатральныя сустрэчы». Год 60-годдзя Камсамола. 1978 год.
**22.00** «Ты, зямля, такая адна». Творчы вечар кампазітара Ігара Лучанка. 1990 год.
**23.05** Дак. фільм «Шафёрская балада».
**23.50** «Джазавая панарама». 1984 год.
**0.30** М/ф «Сустракайце бабулю». 1984 год.
**0.45 Маст. фільм «Жанчыны, якім пашанцавала».**
**3.00** «Народжаныя ў СССР».
**4.00** Праграма «Тэма» з У. Лісцьевым. 1992 год.

### EUROSPORT

**9.30, 13.30, 21.15, 1.30** WATTS.
**10.00** Гран-пры 3.
**11.00** Аўтагонкі. Серыя Blancpain Endurance.
**12.45** Аўтагонкі. Суперкубак Поршэ.
**13.45, 16.15, 23.45** Веласпорт. Тур дэ Франс.
**14.45, 16.00, 21.00, 1.15** Веласпорт.
**21.30** Скачкі на лыжах з трампліна. Летні Гран-пры.
**22.30** Бокс. J. Makabu (Конга) — J. Gomez (Куба).
**23.30, 2.15** Аўта- і матаспорт.

### КАМЕДЫЯ

**5.00, 13.25, 21.00** Камедыя «Уцёкі ў аўтамабілі».
**5.25, 13.55, 21.25** Камедыя «Джоні ў кіно».
**5.30, 14.10, 21.40** Камедыя «Крама ліхвяра».
**6.00** Камедыя «Сцэны ў краме».
**7.25** Меладрама «Яго дзяўчына Пятніца».
**9.00, 16.20, 2.00** Камедыя «Яго новая праца».
**9.35, 16.45, 2.30** Камедыя «Мейбл за рулём, або Гарачы фінал».
**9.50, 17.05, 2.45** Камедыя «Чарлі на забаўляльным мерапрыемстве, або Перапалох на танцпляцоўцы».
**10.05** Камедыя «Джэнтльмены, удачы!».
**11.50** Камедыя «Помста пухнатых».
**14.30** Камедыя «Мытня дае дабро».
**17.20** Камедыя «Алмазны сабака».
**19.20** Камедыя «Адкрытая размова».
**22.10** Камедыя «Жаніх вяртаецца».
**0.00, 4.45** Скетчком «Паміж намі».
**0.15** Камедыя «Няма чаго дэклараваць».
**3.00** Камедыя «Сардэчна запрашаем на поўдзень».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**10.10, 4.40** «Залатая цешча». Серыял.
**11.10** «Паненка і кулінар».
**11.40, 2.40** «Куля-дурніца». Серыял.
**13.20** «Жонка. Гісторыя кахання». Яўгенія Дабравольская.
**14.40** «Сто пытанняў даросламу». Святлана Журава.
**15.30** «Без падману».
**16.15** «Дарослая дачка, або Тэст на...». Маст. фільм.
**18.00, 0.55** «Поўнае шчасце».
**18.30, 1.20** «Шкельца за мільён». Дак. фільм.
**20.00** «Банды Нью-Ёрка». Маст. фільм.
**22.50, 4.10** «Асцярожна, махляры!».
**23.15** «Часова даступны». Чулпан Хаматава.
**0.10** «Белы каўнерык». Серыял.

### ТБ1000

**5.00, 16.55** Трылер «Дар».
**7.10** Камедыя «Па прыкметах сумяшчальнасці».
**9.00** Драма «Вяртанне ў рай».
**11.00** Камедыя «З вачэй — прэч, з чарта — вон!».
**13.00** Драма «Успаміны няўдачніка».
**15.00** Драма «Дрэва».
**19.00** Драма «Заганныя сувязі».
**20.40** Фантастыка «Філосафы: Урок выжывання».
**22.50** Трылер «Пералом».
**1.00** Камедыя «Дзённікі нянькі».
**3.00** Драма «Імператарскі клуб».

### ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

**6.00** Мюзікл «Востраў загінулых караблёў».
**8.35** Драма «Слон».
**10.15** Камедыя «Білет на Vegas».
**12.00** Камедыя «Вусаты нянь».
**13.25** Камедыя «Свята Нептуна».
**14.20** Драма «Высоцкі. Дзякуй, што жывы».
**16.40** Камедыя «Горка!».
**18.30** Камедыя «Той яшчэ Карласан!».
**20.00** Драма «Дом».
**22.15** Прыгоды «1812: Уланская балада».
**0.05** Меладрама «Клоўны».
**2.05** Трылер «Артэфакт».
**3.40** Мюзікл «Стылягі».

### NATIONAL GEOGRAPHIC

**5.00** Інжынерныя ідэі.
**6.00** Цяжкае золата Аляскі.
**7.00** Золата Юкана.
**8.00, 18.00, 23.00** Космас: Прастора і час.
**9.00, 17.00, 22.00** Навука будучага Стывена Хокінга.
**10.00** Займальная навука.
**11.00** Суперзбудаванні.
**12.00** Суперзбудаванні Трэцяга рэйха.
**14.00** Гіена, царыца драпежнікаў.
**15.00** Самыя небяспечныя жывёлы.
**16.00** Экстрэмальнае падарожжа.
**19.00** З пункту гледжання навукі.
**20.00, 0.00, 3.00** Космас: прамы эфір.
**21.00** Жыццё ў космасе.
**1.00** Навуковыя недарэчнасці.
**3.00** Зрабі або памры.

### DISCOVERY

**7.00** Як гэта ўстроена?
**7.25** Паляўнічыя на склады.
**8.15** Скарбашукальнікі Амерыкі.
**9.10** Чыгунка Аляскі.
**10.05, 0.00** Дзённікі вялікай вайны.
**11.00, 23.00, 2.40** Дзіўныя сувязі.
**11.50** Цуды Сонечнай сістэмы.
**12.45** Горад навыварат.
**13.40** Выратавальны яд.
**14.35, 21.00** Круцей не прыдумаеш.
**15.30, 3.30** Смяротны ўлоў.
**19.10** Самагоншчыкі.
**20.05, 1.50** Наезнікі пекла.
**22.00** Дынама — неверагодны ілюзіяніст.
**0.55** Рыбацкія легенды.
**4.20** Маланкавыя катастрофы.
**4.45** Як гэта зроблена?
**5.10** Аўтападполле.
**6.05** Мотабітва.




## КАМУ СОЛАДКА, КАМУ ГОРКА

...Завядзёнка гэта, хоць, можа, і ў іншай форме, існуе і цяпер: у канцы жніўня, перад самым пачаткам новага навучальнага года, настаўнікі-прадметнікі з усяго раёна збіраюцца на пасяджэнні навуковых секцый. Там абмяркоўваюцца ўсе змяненні ў праграмах, дэманструецца новае абсталяванне вучэбных кабінетаў, адбываецца знаёмства з маладымі спецыялістамі, якія прыехалі ў школы па размеркаванні, і многае, многае іншае...

Дык вось. Гадоў сорак таму пасля чарговага пасяджэння мы, чалавек трыццаць настаўнікаў працоўнага навучання (і сярод іх дзве маладзенькія выпускніцы, калі памяць не падводзіць, Мазырскага педінстытута) на аўтобусе вярталіся ў Пінск з вёскі Новы Двор. Дарога была як дарога — нічога незвычайнага. І на купку моладзі, якая стаяла за скрыжаваннем, мы не звярнулі б асаблівай увагі. Але ж, пад'ехаўшы бліжэй, раптам заўважылі, што яна расступілася, а на самай сярэдзіне дарогі раптам «вырас» стол — з боханам хлеба і чарачкай солі. Зазвычай так сустракаюць маладых. І яны тады павінны выйсці з машыны ці аўтобуса, прыняць віншаванні ды выставіць так званы «канверт»: на кожны рог стала — па пляшцы гарэлкі ці віна, а ў цэнтр — яшчэ адну (з закускай).

Тут жа хлопцаў, мусіць, смага душыла: зачакаліся, відаць, картэжу і наш, нічым не адметны аўтобус прынялі за вясельны.

Што было рабіць?

Я, як кіраўнік секцыі, паклікаў адну з маладзенькіх настаўніц. Разам з ёю мы выйшлі да хлапцоў. Меркавалася, што зараз я скажу ім, хто мы такія, адкуль едзем, і яны ўбачаць, што памыліліся. Аднак падвыпіўшыя дзецюкі нават рот нам адкрыць не далі: яны шумелі, нешта крычалі... Але ж потым, як і варта было чакаць, галасы іх зліліся разам у магутным: «Гор-ка-а-а!»...

Колькі разоў пракрычалі яго, сказаць не бяруся, але ж я, каб неяк супакоіць гарлапанаў і выйграць час, трохі прытуліў да сябе дзяўчыну, зрабіў выгляд, быццам бы цалую яе.

Ды дзе там — нумар не прайшоў: хлопцы са сваім «Гор-ка!» узяліся лютаваць яшчэ больш. І я ўжо не бачыў іншага выйсця, як па-сапраўднаму абняць маладую і досыць прыгожую настаўніцу і... пацалаваць.

Шчыра скажу: галава ў мяне закружылася, зямля з-пад ног паплыла... І я не ведаю, чым бы гэта скончылася, калі б раптам натоўп не сціх, не супакоіўся, не адхлынуў ад нас. Як потым дайшло, увагу яго прыцягнуў іншы аўтобус, які паказаўся ў пачатку вуліцы. Ён, як і належыць вясельнаму, быў увіты markрознымі стужкамі і, мусіць, хацеў сэканоміць на «канверце», праскочыць міма. Таму крыкуны, падхапіўшы свой стол, кінуліся наперарэз...

Інцыдэнт, як той казаў, быў вычарпаны: мы з дзяўчынай зайшлі ў салон, каб ехаць далей.

Як гэта ні дзіўна, нам ніхто нічога не сказаў: калегі маўчалі амаль усю дарогу да горада. Ні разу не паглядзела ў мой бок і мая «абранніца» Святлана Іванаўна...

У хуткім часе, казалі, яна выйшла замуж, некуды з'ехала. І магчыма, забылася на той нечаканы пацалунак. А я вось памятаю... Можа, нават лепей, чым першы.

**Я. МІШУЦІН,** *г. Пінск*

## ДОБРАЯ ПРЫПРАВА

Мяне заўсёды абурае, калі чытаю, што сала — гэта, маўляў, брэнд украінцаў. Як быццам, людзі Беларусі могуць ім саступіць? Ды ні ў якім жа разе! Я нават болей скажу: мы на сале выраслі... Як спецыялісты таксама, бо на фортках студэнцкіх інтэрнатаў (халадзільнікаў тады не было) заўсёды віселі поўныя сеткі. І ўсе старшакурснікі проста абавязкам сваім лічылі навучыць маладых пісаць лісты дадому. Іх, паводле гэтай навукі, трэба было пачынаць словамі: «Вышліце сала!», а ўжо потым пісаць: «Добры дзень, дарагія мама і тата!»

Тое, што продкі (у шырокім сэнсе гэтага слова) разводзілі свіней, пацвярджае і палясоўшчык Тарас, які неяк (прабачце за рыфму) трапіў на Парнас:

«...Узлез. Гляджу — будынак новы
Стаіць, зазвычай панскі двор.
Кругом абнесен тын яловы:
Нябойсь, сюды не ўлезе вор!
А на двары тым свінні ходзяць,
Каровы, козы, бараны...
Знаць, і багі хазяйства водзяць,
Калі свіней дзяржаць яны».

...«Дзяржаў» іх і мой аднавясковец (назавём яго Міколам), больш за тое — парадкаваў сам. Сала, прынамсі, то проста перасыпаў соллю, то варыў, то трымаў у вадзе, то — у адвары шалупіння цыбулі... Адно — кожны разочак з прыправамі: з часначком, з каляндрай, з папрыкай, з чорным молатым перцам, з кменам, базілікам, лаўровым лістом (не рабіў хіба сала ў шакаладзе, як гэта прыдумалі ва Украіне)... І есці яго любіў. А паколькі працаваў шафёрам, то ў машыне заўсёды меў нейкі агурок-памідор, пару цыбулін і добры шмат сала. Адрэзаў ад яго, з'еў — і ніякага табе клопату з абедам...

Дык вось. Неяк вазіў Мікола льнотрасту. А там дзе лён, там жа і мышы. Залезлі яны ў Міколаву кабіну, знайшлі там астаткі падмацунку і, як водзіцца, не столькі з'елі яго, колькі напаскудзілі. «Сала трэба будзе дамоў забраць, хоць сабака чарвячка заморыць», — падумаў Мікола. А вось забраць той гасцінец — забыўся. Назаўтра кінуўся, а сабачага пачастунку няма — як карова языком злізала. «Няўжо мышы з'елі?» — не паверыў вачам гаспадар.

Праўда адкрылася праз некалькі дзён, калі сустрэўся з калегамі. Тыя і расказалі, як напярэдадні ў гаражы штосьці адзначалі, як гарэлкі купілі, грошы знайшлі, а вось на закусь вырашылі не траціцца: навошта, калі ў Міколы сала ёсць...

Прыкусвалі ім у поцемках (святла не ўключалі — баяліся, каб начальства не застукала) і аднадушна прызналі, што засол удалы быў — смачнае сала. Адзінае — пыталіся, што за прыправа там? Як быццам, падобная на каляндру, але ж, мусіць, не яна?..

— Не ведаю... Той засол мая жонка рабіла, — схлусіў Мікола.

Ну, не псаваць жа хлопцам настрой!

**В.М. ГАЎРЫШ,** *г.п. Чавусы*

## ПЕРАДАЧКА

...Ужо некалькі гадоў, з'ехаўшы з вёскі, Толік працаваў у сталіцы і жыў, як іншыя: праца, сям'я...

З Войтакам, сваім земляком, ён сутыкнуўся выпадкова — у нядзелю, на рынку. Рад быў. І сустрэчу яны, як трэба, адзначылі — пасядзелі ў кавярні. Напрыканцы вячэры Толік сказаў:

— Не выпадае мне з'ездзіць дамоў. Можа, я праз цябе маме грошай перадам? Ты ж завязеш?

— Чаму ж не? — здзівіўся таварыш. — Няўжо мне цяжка да цёткі Ганны зайсці? Давай...

Але ж беручы, вочы такі вылупіў: сума, мякка кажучы, была велікаватай, яна замуляла Войтаку, адтапырыўшы кішэнь. Яна замінала, пакуль той хадзіў па горадзе, пакуль ехаў на вакзал. Адтуль ужо ён набраў Толікаў мабільны. Сказаў:

— Дружа, тут такая справа. Я ўсе свае пінёндзы ў тваім горадзе прафукаў. Можна, я вазьму трохі з тваёй перадачкі? Няшмат — на цыгарэты сабе і білет?

Толік нічога супраць не меў.

Войтак прыехаў у райцэнтр і завітаў там у госці да знаёмца — расказаў яму пра сустрэчу ў Мінску.

— Дык Толік жа сваяк мой, пляменнік траюрадны! — усклікнуў дзядзька. — Я ж яго пад сталом яшчэ помню — ён туды пехатою хадзіў... А цяпер, бач ты, разбухаўся... Колькі, кажаш, цётцы Ганне перадаў?

Войтак назваў суму.

Дзядзька пачухаў патыліцу, паўздыхаў і таксама зняў слухаўку:

— Алё, галубок? Тут да мяне Войтак зайшоўся, прывітанне ад цябе перадаў — дзякуй. Сядзім во, гамонім з ім... А помніш — я цябе малога ў парк на каруселі вазіў? Тота... Не, я цяпер састарэў ужо, не езджу, хваробы не адпускаюць... Дык можа, ты са сваёй перадачкі на таблеткі мне трохі падкінеш?

Толік згадзіўся.

Праз гадзіну Войтак прыехаў у вёску, сустрэў яшчэ аднаго прыяцеля — распавёў пра жыццё ў сталіцы, пра Толіка.

— Грошы, бач, дамоў перадаў, — закончыў ён і назваў суму.

— Няўжо столькі? — прысвіснуў суразмоўца.

І хвіліны праз дзве ўжо таксама набіраў Мінск, скардзіўся на жыццё ў вёсцы, казаў, што ў плуг тут — бывае — хоць сам станавіся, а заробкаў ніякіх...

— Можа, да палучкі выручыш? — папрасіў напрыканцы. — Прыедзеш да маці — я разлічуся: хоць першачком, хоць мёдам.

Толік, вядома ж, выручыў.

Тым часам сцямнела. Ісці да цёткі Ганны ўжо не выпадала: Войтак адклаў гэты візіт на заўтрашні вечар. А раніцай, як заўсёды, ён быў на мехдвары.

— Хлопцы, — расказваў, — Толік у горадзе такія бабкі грабе... Яго месяц як нашы тры! Не верыце? Ды паглядзіце (Войтак выцягнуў з кішэні скрутак і агучыў суму), колькі ён дамоў перадаў.

— А на халеру? — вымавіў нехта. — Цётка ж Ганна і так нядрэнна жыве: парсюка трымае, курэй цэлы двор... А нам ён што — голае прывітанне прышлаў? Хоць бы на пляшку якую... Разам жа працавалі...

Пасля гэтых слоў Войтак яшчэ раз патэлефанаваў Толіку — агучыў просьбу калектыву.

Той яе зразумеў.

...Пасля працы, як і збіраўся, Войтак зайшоў да цётачкі Ганны. З парога гукнуў:

— Добры вечар вам!.. Я во надоечы ў сталіцы быў, сына вашага бачыў. Ён грошай са мной перадаў. Малавата, вядома ж, але хопіць — на раз у краму схадзіць: хлеба там купіць, малака, крыху каўбаскі якой...

— А як жа ён сам? — занепакоілася гаспадыня.

— Ды зблажэлы, цётачка: збляднелы, худы... І чаго ён у той горад папёрся? Лепш бы тут у калгасе працаваў...

Раніцой наступнага дня цётка Ганна з сумкамі шыбавала на пошту — адпраўляць пасылку. Паклала ў скрынку добры шмат сала, яек, трохі маладой бульбы, памідораў, агуркоў... Збоку незаўважна ўсунула канверцік з грашыма.

— Няхай сыночак паесць, — казала бабуля паштаркам. — Хто, як не маці, аб ім паклапоціцца? Кажуць, гібее там...

**Андрэй СІДАРЭЙКА,**
*м. Каравацічы, Рэчыцкі раён*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**

■ Здароўе нацыі

# КАЛІ Б НЕ ЗЛОЎЖЫВАННЕ...

**Сусветная арганізацыя аховы здароўя апублікавала штогадовы зборнік даных з аналізам выканання краінамі «мэт развіцця тысячагоддзя і глабальных паказчыкаў у галіне аховы здароўя». Сярод мэт развіцця тысячагоддзя — скарачэнне дзіцячай смяротнасці, паляпшэнне аховы мацярынства, барацьба з ВІЧ/СНІДам, малярыяй і іншымі захворваннямі. Сістэме аховы здароўя Беларусі тут даецца высокая ацэнка.**

### Скарачэнне дзіцячай смяротнасці

У Беларусі верагоднасць дзіцячай смяротнасці да 5 гадоў складала 5 працэнтаў на 1000 нованароджаных. Гэта лепшы паказчык у СНД. Аналагічныя маюць Грэцыя, Літва, Іспанія, Польшча, Харватыя.

У 1990-2012 гадах прышчэпкі ад адру атрымалі 100 працэнтаў дзяцей ва ўзросце да 1 года. Беларусь па гэтым паказчыку апярэджвае такія еўрапейскія краіны, як Аўстрыя, Сербія, Украіна, Францыя, Латвія, Італія, Швейцарыя, Ісландыя, Вялікабрытанія.

### Паляпшэнне аховы мацярынства

У нашай краіне гэты паказчык — адзін са стабільна нізкіх у ахове здароўя (як у Ізраілі, Польшчы, Фінляндыі).

Па ўзроўні доступу да паслуг аховы рэпрадуктыўнага здароўя Беларусь перавышае на 5 працэнтаў неабходны 90-працэнтны парог і адпавядае ўзроўню Чэхіі, Францыі, Фінляндыі, Польшчы, Люксембурга, Чарнагорыі, Славакіі, Венгрыі.

Беларусь уваходзіць у 50 лепшых краін свету па пытаннях вядзення цяжарнасці (у падмурак такога крытэрыю пакладзены прынцып частаты дародавых зваротаў да ўрача — ад 1 да 4 наведванняў), вядзення родаў кваліфікаваным медыцынскім персаналам.

Па ўзроўні незадаволеных патрэб у планаванні сям'і (разлічваецца на падставе працэнта жанчын, якія здольны нараджаць, але адкладваюць гэта) мы не адрозніваемся ад большасці развітых краін Еўропы.

### Глабальныя паказчыкі

Эксперты СААЗ адзначаюць станоўчую дынаміку росту колькаснага паказчыка жыцця з 1990-га па 2012 год — мужчыны з 66 гадоў да 67, жанчыны з 76 да 78.

Беларусь займае адно з вядучых месцаў сярод краін свету па доступе насельніцтва да медпаслуг: мы дзелім першае месца ў свеце з Брунеем і Канадай.

Адно з вядучых месцаў краіна займае і па правядзенні імунных мерапрыемстваў.

На фоне станоўчых даных адносна доступу да пітной вады, прымальных санітарных умовах, пытаннях дзіцячай медыцыны звяртаецца ўвага на неспрыяльную статыстыку ўжывання алкагольнай і тытунёвай прадукцыі.

Агульны ўзровень расходаў айчыннага дзяржаўнага бюджэту на ахову здароўя склаў у 2011 годзе 13 працэнтаў — гэта дзявяты паказчык у еўрапейскім рэгіёне.

### Барацьба з ВІЧ/СНІДам, малярыяй і іншымі захворваннямі

Па сярэднегадавых тэмпах зніжэння каэфіцыента распаўсюджанасці ВІЧ/СНІД з 2001-га па 2012 год Беларусь сярод дзяржаў СНД займае 2-е месца.

Беларусь сярод краін СНД займае лідзіруючае становішча па прадастаўленні антырэтравіруснай тэрапіі хворым.

Па сярэднегадавым тэмпе зніжэння захваральнасці на туберкулёз у 1990—2012 гг. Беларусь апярэджвала Фінляндыю, Венгрыю, Швейцарыю, Харватыю, Аўстрыю, Нарвегію, Іспанію, Бельгію, Італію, Славенію.

**Святлана БАРЫСЕНКА**

■ На свае вочы

# ЗА ЯКАСЦЬ ПАСЛУГ «ГАЛАСУЕМ НАГАМІ»

## Як можна сапсаваць уражанні ад цікавай турыстычнай вандроўкі?

**Арганізатары міжнароднага праекта запрасілі польскіх і беларускіх журналістаў у прэс-тур па Сувальшчыне і Гродзеншчыне, каб прэзентаваць «Вандроўку ў этнаказку». Мы на свае вочы ўбачылі, што знаёмства з этнакультурнымі аб'ектамі трансгранічнага рэгіёна можа быць вельмі захапляльным і пазнавальным (падрабязнасці ў нумары «Звязды» за 11 ліпеня). Аднак гэта яшчэ не гарантуе, што цікавы турыстычны прадукт будзе запатрабаваны вандроўнікамі. Могуць перашкодзіць візавыя пытанні, незацікаўленасць з боку турфірмаў, а таксама арганізацыйныя пралікі, пра якія пойдзе гаворка ў гэтых нататках.**

**Я не прэтэндую на ролю эксперта ў сферы турызму. Але вось якія ўражанні засталіся ў мяне як у звычайнага падарожніка.**

### Добразычлівасць як прафесійны стандарт

І на Сувальшчыне, і на Гродзеншчыне для ўдзельнікаў прэс-тура адбыліся вечарыны ў аграсядзібах. Як па мне, дык анімацыйная праграма ў нас была больш цікавая: гурт з Лідскага раённага цэнтра рамёстваў і традыцыйнай культуры прапанаваў гасцям не толькі народную музыку, але і танцавальны майстар-клас. А вось што тычыцца такой «дробязі», як бытавыя ўмовы для турыстаў...

Да пытанняў сэрвісу арганізатары праекта з польскага і беларускага боку падышлі па-рознаму. На Сувальшчыне, паколькі гэтая аграсядзіба не магла забяспечыць начлег усіх вандроўнікаў, іх размясцілі не толькі там, але і непадалёк у атэлі. Усюды былі неабходныя, цывілізаваныя ўмовы, якія выключалі нейкія нязручнасці для гасцей. Зразумела, з магчымасцю прыняць душ, каб у добрым гігіенічным «тонусе», і, адпаведна, настроі, прадоўжыць вандроўку.

Пазітыўнаму настрою спрыяла і добразычлівасць работнікаў сферы паслуг — і ў аграсядзібе, і ў атэлі. Гэта ўжо, пэўна, для іх норма, прафесійны стандарт. Напрыклад, супрацоўнік атэля, праводзячы нас да нумароў, дапамог жанчынам паднесці іх сумкі. А перад снеданнем у кожнага пацікавіліся, якая страва з некалькіх прапанаваных будзе даспадобы.

А вось як сустрэлі ўдзельнікаў прэс-тура на Лідчыне ў аграсядзібе «Альба Рутэнія», якая, дарэчы, некалькі гадоў таму прызнавалася лепшай у вобласці...

### Беларуская экзотыка ці здзек з гасцей?

Менавіта гэты аб'ект, які, паводле рэкламы, пазіцыянуе сябе сядзібай экалагічнага сельскага турызму для аматараў лепшых беларускіх традыцый, выбралі арганізатары праекта з нашага боку. Прычым з поўнай папярэдняй аплатай за паслугі — наколькі мне вядома, каля 1 мільёна рублёў з чалавека за вячэру, начлег і сняданак. І пры гэтым, у адрозненне ад сваіх польскіх партнёраў, не задумаліся над пытаннем, якое зусім не патрабуе глыбокіх ведаў у галіне турыстычнага маркетынгу: ці адпавядаюць магчымасці аграсядзібы элементарным умовам сэрвісу пры абслугоўванні вялікай групы людзей?

Мяркуйце самі. У XXI стагоддзі на 25 чалавек — адзін сумешчаны санвузел з умывальнікам, унітазам і ваннай. Ды яшчэ драўляны «ватэрклазет», дзе праблематычна зачыніць дзверы і адсутнічае туалетная папера. Гэта што, элементы старадаўніх беларускіх традыцый, якія прапануюцца наведвальнікам? Магчыма, так здаецца гаспадару сядзібы. Але чаму арганізатары паездкі, спыніўшы на ёй свой выбар (а гэта ж быў зусім не безальтэрнатыўны варыянт), не паведамілі вандроўнікам, што іх чакае і ці патрэбны ім такія «выгоды»? Некаторыя ўдзельнікі прэс-тура, асабліва жанчыны, былі ў сапраўдным шоку ад умоў, у якія яны былі вымушаны трапіць. Проста дзіву даешся, як гэта маглі не прадбачыць арганізатары праекта з ГрДУ імя Я. Купалы, дзе, дарэчы, рыхтуюць спецыялістаў у галіне турызму.

Зноў жа не трэба быць вялікім маркетолагам у наступнай сітуацыі. Уявіце, што ўсе 25 чалавек становяцца раніцай у чаргу ў адзіны санвузел. Прыняць душ тут — ужо фантастыка, хаця б зубы пачысціць ды памыць твар. Што гэта? Найперш, мяркую, наплявацельскае стаўленне да людзей. А па-другое, відавочна, што калі ўсе кліенты аграсядзібы хаця б па мінімуму выканаюць свой ранішні марафет, то будзе немагчыма ўкласціся па часе ў запланаваную праграму турыстычнай вандроўкі.

Вядома, уладальнік аграсядзібы можа спаслацца на тое, што ён не парушае беларускае заканадаўства аб аграэкатурызме. І сапраўды, сёння для гэтай сферы дзейнасці не існуе жорсткіх патрабаванняў па якасці паслуг і практычна ніякага кантролю за іх аказаннем не ажыццяўляецца. Ды і не сілком жа гаспадар сядзібы прыцягнуў да сябе столькі турыстаў. Яны самі (у нашым выпадку — арганізатары паездкі) павінны думаць, з кім звязвацца.

### «Прыязджайце, вам заўсёды будуць рады!»

Зрэшты, «галасаванне нагамі» наконт якасці паслуг гэтай аграсядзібы (большасць удзельнікаў прэс-тура не захацела тут заставацца, і людзі паехалі начаваць у гасцініцу райцэнтра) было звязана не толькі з вышэйзгаданымі пытаннямі сэрвісу. На такое рашэнне паўплывалі і паводзіны гаспадара сядзібы. «Прыязджайце, тут вам заўсёды будуць рады!» — запэўнівае яе рэклама ў інтэрнэце. Аднак такое ўражанне, што гаспадар і не збіраўся быць са сваімі кліентамі на адной «хвалі» пазітыву, прытрымлівацца простых рэчаў гасціннасці. Сам быў сведкам хамскіх выказванняў з боку гаспадара ў адрас аднаго з гасцей. Няўжо і гэта наша нацыянальная «экзотыка»?

Дарэчы, калі верыць рэкламе, то ў гэтай сядзібе «лазня адкрыта для ўсіх ахвотных». Адзін з журналістаў паспрабаваў заказаць такую паслугу, быў гатовы заплаціць, але атрымаў катэгарычную адмову. Маўляў, лазня прызначана толькі для сям'і, якая тут пражывае...

Увогуле праблемы колькасці аграсядзіб (у прыватнасці, на Гродзеншчыне) ужо, пэўна, не існуе. А вось праблема якасці паслуг, як бачым, ёсць. Ужо пасля прэс-тура прачытаў у інтэрнэце, а таксама пачуў ад калегі зусім не прыемныя ўспаміны ад знаходжання ў «Альба Рутэніі». І хіба ж не варта было правесці адпаведны маніторынг грамадскай думкі аб гэтай сядзібе арганізатарам нашай вандроўкі? Гэта для іх таксама ўрок на будучыню. Ды і, зразумела, для ўсіх, хто хоча не памыліцца ў сваім выбары таго ці іншага аб'екта сферы паслуг. Трэба цікавіцца не толькі яго рэкламай, але і водгукамі людзей, якія тут ужо пабывалі.

— Упэўнены, што вам надоўга запомніцца гасцінны прыём з боку гаспадароў сядзібы, — чытаю ў інтэрнэце рэкламу «Альба Рутэніі».

Вядома ж, такі прыём не можа не запомніцца. Уражанні асабіста ў мяне (ды і, наколькі ведаю, у многіх іншых удзельнікаў прэс-тура) такія, што зноў туды прыехаць жадання няма. У адрозненні, дарэчы, ад шэрагу іншых, сапраўды гасцінных аграсядзіб на Гродзеншчыне. Але нас, на жаль, туды не запрасілі...

**Барыс ПРАКОПЧЫК**

■ Неасабісты суб'ектыў



# У ПОШУКАХ «ІСЦІНЫ»?

## «Зялёны дэман» пільнуе кожнага з нас. Камусьці падсоўвае таннае «чарніла», камусьці — дарагі каньяк

Кожную раніцу панядзелка ёсць у маім рабочым распарадку адзін напружаны момант. Хвілін пятнаццаць, калі праглядаеш на сайтах хроніку здарэнняў за выхадныя. Хвалюешся не з-за журналісцкага імпэту: вось, маўляў, добрая тэма для газеты, а з-за прадчування таго чалавечага болю, які зараз пальецца на цябе з абыякавай інфармацыйнай стужкі. Часам болю менш: бываюць такія шчаслівыя выхадныя, калі ніхто не загінуў і сур'ёзна не пакалечыўся. Часам, як у мінулы панядзелак, яго зашмат: здарэнняў з трагічнымі наступствамі было — «на любы густ». Хтосьці скажа: гэта ўсё поўня — акурат у мінулыя суботу ды нядзелю яна была неяк надзвычай блізка ад зямлі і асабліва ўплывала і на тэхніку, і на паводзіны людзей. Можа, яно і так, толькі як па мне, дык спадарожнік нашай планеты тут абсалютна ні пры чым. Бо ва ўсіх здарэннях, некаторыя з якіх з-за сваёй недарэчнасці былі б проста смешнымі, калі б не былі такімі сумнымі, чырвонай ніткай праходзіць тое, што іх аб'ядноўвае.

Вы не здагадваецеся, пра што я? Што ж, мяркуйце самі. Мінск. «Грузавы аўтамабіль наехаў на 38-гадовага пешахода, які знаходзіўся на праезнай частцы ў стане алкагольнага ап'янення. Пацярпелы быў шпіталізаваны і памёр у бальніцы». Івацэвіцкі раён. «Два нецвярозыя маладыя чалавекі ледзь не забілі гаспадара «Аўдзі» і яго пасажыра, спрабуючы завалодаць яго аўтамабілем. Яны папрасілі падвезці іх да суседняй вёскі. Калі машына спынілася, кухонным нажом ударылі пасажыра, а вадзіцелю нанеслі шэсць удараў па галаве. На шчасце, той усё ж сумеў выцягнуць ключ з замка запальвання і ўцячы»... Мазырскі раён. «Ноччу 27-гадовы мазыранін на чыгуначнай станцыі вырашыў не абыходзіць цягнік, а пралезці пад ім. Састаў рэзка крануўся, і малады чалавек апынуўся пад коламі. У выніку яму адрэзала абедзве нагі і тры пальцы на руцэ. Пацярпелы на момант здарэння быў выпіўшы». Любанскі раён. «П'яны вадзіцель не справіўся з кіраваннем, аўтамабіль з'ехаў у кювет і перавярнуўся. У выніку пасажыр апынуўся ў бальніцы»... Хопіць? Чакайце, гэта яшчэ далёка не ўсё! Нават калі па загалоўках прабегчы: «П'яны мужчына ўтапіўся на Чыжоўскім вадасховішчы ў Мінску», «Прапаўшы без вестак жыхар Мінска аказаўся забітым у п'янай бойцы»... А ў вёсцы Лядавічы Іванаўскага раёна і зусім дэтэктыўная гісторыя здарылася: па незразумелых прычынах узарваўся жылы дом, а вельмі п'янага гаспадара з апёкамі пажарныя знайшлі на вышках у хляве...

Вось такая «п'яная» гісторыя. І гэта — за адны выхадныя ў адной невялікай краіне. А колькі дурных учынкаў засталося за кадрам, па-за зводкамі міліцыі і ратавальнікаў, бо, па шчаслівай выпадковасці, трагедыі не адбылося...

Не чакайце, што буду гаварыць пра тое, што з п'янствам трэба змагацца больш жорстка, што трэба забараніць або абмежаваць продаж спіртнога, узмацніць адміністрацыйную і крымінальную адказнасць. Шмат што ў гэтым плане робіцца, гэтыя прапісныя ісціны ўжо нагналі аскому, а недарэчных нецвярозых гісторый, нярэдка з непапраўнымі наступствамі, менш не становіцца. Выходзіць, справа не толькі ў ступені даступнасці і цане алкаголю?..

І размова тут не толькі пра запойных п'яніц, алкаголікаў, якія ва ўсім свеце прызнаны хворымі людзьмі і якіх трэба лячыць і дзесьці нават, нягледзячы на іх непрыглядны твар, шкадаваць. Размова пра нас усіх — такіх «прыстойных», цвярозых, законапаслухмяных. Калі задумацца, нават у самай інтэлігентнай кампаніі самыя папулярныя гісторыі, якія здараюцца з некім з гэтай самай кампаніі і якія пасля ўспамінаюць са смехам і жартамі, — звязаны з алкаголем. Ледзь не ўсе смелыя, адчайныя ўчынкі, на якія не адважваемся гадамі, але здзейсніўшы якія, вельмі імі ганарымся, мы робім калі не «пад мухай», дык «глынуўшы для храбрасці». «Глытаючы», здымаем празмерны стрэс на працы, адзначаем радасную падзею (нібы радавацца проста, без «дабаўкі» ўжо і не ўмеем). «Знясіленыя» штодзённай аднастайнасцю, шукаем не спосаб, як разнастаіць жыццё, а «глытаючы» (вядома, зусім не шмат, для настрою). І на душы адразу робіцца весела і бесклапотна, і можна лёгка пайсці купацца на глыбіню, ледзь умеючы плаваць, сесці ў машыну і цiснуць, ціснуць на газ, ловячы адчуванне палёту, палезці пад цягнік, скарачаючы шлях, узбіцца куды на вышыню, каб сустрэць сонца... І калі пашанцуе і ўсё абыдзецца, стукаем сябе пяткай у грудзі, лашчым самалюбства: маўляў, я зусім не цвярозы зануда, а — о-го-го! Калі не пашанцуе і не абыдзецца — абыякавая інфармацыйная стужка папоўніцца яшчэ адным «п'яным» здарэннем.

«Зялёны дэман» пільнуе кожнага з нас. Камусьці проста шэпча жартаўліва: «З раніцы выпіў — дзень свабодны», камусьці, больш адукаванаму, падкідвае блокаўскае: «Я знаю: истина в вине». Камусьці падсоўвае таннае «чарніла», камусьці — дарагі каньяк. Сродкі розныя — вынік адзін: мы, самі таго не ўсведамляючы, хоць на некалькі хвілін трапляем да яго ва ўладу. І гэтыя некалькі хвілін ён робіць з намі, што хоча: з кімсьці проста гуляе, забаўляючыся, а кагосьці заманліва падштурхоўвае да апошняй рысы.

...Мы нядаўна з прыяцелькамі, сур'ёзнымі дзелавымі дамамі, за келіхам віна (выпілі толькі па келіху, дый віно было сухое і дарагое) згадвалі каторы раз даўнюю інтэрнацкую гісторыю. Як студэнткамі, выпіўшы вермуту, на прапанову хлопцаў, што жылі пад намі, пакаштаваць, чым «частуюцца» яны, спусцілі сяброўку з акна восьмага паверха ўніз галавой і трымалі яе за ногі, пакуль суседзі налівалі ёй нешта ў чарку... Бадай упершыню за гады, што прайшлі з таго выпадку, мы ўспаміналі яго без смеху, а з жахам. Можа, таму што ў некаторых ужо сваім дзецям па столькі, колькі было тады п'янаватым дурніцам? А можа, таму што ўпершыню «зялёны дэман», не тоячыся, зазірнуў прама ў вочы?..

**Алена ЛЯЎКОВІЧ**

■ Круці педалі!

# «ВЕЛАЗМЕЙКА» Ў ЦЭНТРЫ ГРОДНА

## Жыхары горада над Нёманам папоўнілі рады «дыпламаваных» веласіпедыстаў

**Сярод іх быў і аўтар гэтых радкоў, які разам з калегамі ўдзельнічаў у акцыі з нагоды старту ў Гродне сёлетняга сезона «Акадэміі velocity».**

Спачатку мы разам з фітнес-інструктарам размялі свае мышцы, а затым селі на веласіпеды, каб праехаць па «вясёлым тратуары» (не зачапіўшы дзяўчыну з сабакам і іншых няўважлівых пешаходаў), выканаць манеўраванне «змейкай», пераадолець «ляжачага паліцэйскага»... Пасля гэтых і іншых практычных этапаў здалі экзамен па веданні знакаў і правілаў дарожнага руху, сфатаграфаваліся і атрымалі вадзіцельскае пасведчанне «Акадэміі velocity». Няхай і не афіцыйнае, але як факт, што веласіпедыст прайшоў пэўны курс падрыхтоўкі.

А напрыканцы — латарэя з розыгрышам веласіпеда беларускай кампаніі AIST, якая з'яўляецца тэхнічным партнёрам гэтага праекта. Удача ўсміхнулася нештатнаму фотакарэспандэнту «Звязды» Яраславу Ванюкевічу. Віншуем!

Пасля журналістаў заняткамі ў «Акадэміі velocity» зацікавіліся і многія іншыя гродзенцы: «велаправы» атрымалі 278 чалавек.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

**ДА ВЕДАМА:**

***«Акадэмія velocity» — гэта праект кампаніі velcom, накіраваны на развіццё велаінфраструктуры беларускіх гарадоў і папулярызацыю веласіпеда. Сёлета першыя 25 велапарковак будуць устаноўлены ў Мінску, Гомелі, Брэсце, Магілёве і Гродне і яшчэ 30 — у самых актыўных у «велажыцці» гарадах.***



Фота Яраслава ВАНЮКЕВІЧА.

**белагропромбанк** традиции будущего

В соответствии с условиями договоров срочного банковского вклада (депозита) ОАО «Белагропромбанк» сообщает о снижении с 19 августа 2014 года до 32% годовых размера процентной ставки по договорам срочного банковского вклада (депозита) «Забота», заключенным до 18 июля 2014 года.

**ПОЗВОНИ В СВОЙ БАНК** 136

**время работы Контакт-Центра Банка**
**8.00–20.00 – рабочие дни**
**8.00–18.00 – выходные и праздничные дни**

**Звонок со стационарного телефона, с мобильного телефона (life:), velcom, МТС) – по тарифам операторов связи. Консультации оказываются бесплатно.**

**www.belapb.by**

Лицензия на осуществление банковской деятельности №2 от 26 мая 2014 года, выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100693551.

## Вниманию акционеров ОАО «Белсолод»

**29 июля 2014 г. по адресу: г. Иваново, ул. Полевая, 32**
**СОСТОИТСЯ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ.**
**Начало работы собрания в 13.30.**
**Время регистрации участников собрания – в день проведения собрания с 12.30 до 13.30.**
**Участникам собрания иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера – также доверенность или договор).**
**С информацией (документами) при подготовке к проведению собрания можно ознакомиться с 22 июля в рабочие дни с 9.00 до 16.00.**

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

1. О передаче в собственность гражданам жилых домов.

УНП 200075434 *Наблюдательный совет.*

**Куплю любое авто. 8 029 6510099 Велком, 8 029 7918210 МТС**

**Уважаемые акционеры открытого акционерного общества**

## «Дорожно-строительный трест № 1, г. Витебск»

**29 июля 2014 года в 15.00**
**СОСТОИТСЯ СОВМЕСТНОЕ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ**
**открытого акционерного общества «Дорожно-строительный трест № 1, г. Витебск» и учредителя РКУПСХП «Островно».**

**Собрание пройдет по адресу Общества: г. Витебск, ул. Суворова, 16, актовый зал.**

**ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ:**

1. О выплате дивидендов за 1 полугодие 2014 года.
2. Об утверждении передаточного акта при присоединении РКУПСХП «Островно» к ОАО «ДСТ-1, г. Витебск».
3. Об увеличении уставного фонда ОАО «ДСТ-1, г. Витебск» путем дополнительного выпуска акций.
4. Об утверждении решения о выпуске акций.
5. О внесении дополнений и изменений в устав ОАО «ДСТ-1, г. Витебск».

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: г. Витебск, ул. Суворова, 16 (наблюдательный совет), с 22 по 28 июля 2014 г. (время работы с 8.30 до 17.30), тел 37 45 66.

**Регистрация участников собрания с 14.00 до 14.45 по месту проведения собрания.**

Реестр владельцев ценных бумаг и список лиц, имеющих право на участие в общем собрании акционеров, составлен по состоянию на 17 июля 2014 г.

Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру общества — паспорт, представителю акционера — паспорт и доверенность.

УНП 300000398 *Наблюдательный совет*

# Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

## ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| **ЛОТ 1** | |
| Наименование объекта, краткая характеристика | - Капитальное строение, инв. № 110/С-104679 (назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – административное здание), площадью 234,8 кв.м, расположенное по адресу: Брестская область, Барановичский р-н, Леснянский с/с, аг. Лесная, ул. 17 Сентября, 44.<br>- Капитальное строение, инв. № 110/С-105506 (назначение – здание специализированное торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – склад техматериалов), площадью 136,0 кв.м, расположенное по адресу: Брестская область, Барановичский р-н, Леснянский с/с, аг. Лесная, ул. 17 Сентября, 44А/4.<br>- Капитальное строение, инв. № 110/С-105504 (назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – здание компрессорного отделения), площадью 48,5 кв.м, расположенное по адресу: Брестская область, Барановичский р-н, Леснянский с/с, аг. Лесная, ул. 17 Сентября, 44А/1.<br>- Капитальное строение, инв. № 110/С-107508 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – мазутное хозяйство), площадью 0,0 кв.м, расположенное по адресу: Брестская область, Барановичский р-н, Леснянский с/с, аг. Лесная, ул. 17 Сентября, 44/3.<br>- Капитальное строение, инв. № 110/С-105509 (назначение – здание многофункциональное, наименование – сушилка с котельной), площадью 1087,2 кв.м, расположенное по адресу: Брестская область, Барановичский р-н, Леснянский с/с, аг. Лесная, ул. 17 Сентября, 44Ж.<br>- Капитальное строение, инв. № 110/С-105503 (назначение – здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель, наименование – распиловочный цех), площадью 1104,1 кв.м, расположенное по адресу: Брестская область, Барановичский р-н, Леснянский с/с, аг. Лесная, ул. 17 Сентября, 44Д.<br>- Капитальное строение, инв. № 110/С-105508 (назначение – здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель, наименование – механо-сборочное отделение), площадью 2084,5 кв.м, расположенное по адресу: Брестская область, Барановичский р-н, Леснянский с/с, д. Лесная.<br>- Капитальное строение, инв. № 110/С-105601 (назначение – здание специализированное автомобильного транспорта, наименование – здание гаража), площадью 243,8 кв.м, расположенное по адресу: Брестская область, Барановичский р-н, Леснянский с/с, аг. Лесная, ул. 17 Сентября, 44/2.<br>- Капитальное строение, инв. № 110/С-107507 (назначение – сооружение специализированное водохозяйственного назначения, наименование – артскважина), площадью 80,0 кв.м, расположенное по адресу: Брестская область, Барановичский р-н, Леснянский с/с, аг. Лесная, ул. 17 Сентября, 44.<br>- Капитальное строение, инв. № 110/С-107506 (назначение – здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель, наименование – раскройное отделение), площадью 1361,6 кв.м, расположенное по адресу: Брестская область, Барановичский р-н, Леснянский с/с, аг. Лесная, ул. 17 Сентября, 44Б/3.<br>- Капитальное строение, инв. № 110/С-105510 (назначение – здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель, наименование – раскройное отделение), площадью 1937,8 кв.м, расположенное по адресу: Брестская область, Барановичский р-н, Леснянский с/с, аг. Лесная, ул. 17 Сентября, 44Г.<br>- Капитальное строение, инв. № 110/С-105499 (назначение – здание специализированное для бытового обслуживания населения, наименование – баня-душ), площадью 87,2 кв.м, расположенное по адресу: Брестская область, Барановичский р-н, Леснянский с/с, аг. Лесная, ул. 17 Сентября, 44Е.<br>- Капитальное строение, инв. № 110/С-105500 (назначение – здание специализированное энергетики, наименование – трансформаторная будка), площадью 49,2 кв.м, расположенное по адресу: Брестская область, Барановичский р-н, Леснянский с/с, аг. Лесная, ул. 17 Сентября, 44Г/1.<br>- Капитальное строение, инв. № 110/С-105501 (назначение – здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель, наименование – отделочное отделение), площадью 788,8 кв.м, расположенное по адресу: Брестская область, Барановичский р-н, Леснянский с/с, аг. Лесная, ул. 17 Сентября, 44Б. |

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| **ЛОТ 1** | |
| Наименование объекта, краткая характеристика | - Капитальное строение, инв. № 110/С-105502 (назначение – здание специализированное растениеводства, наименование – теплица), площадью 398,8 кв.м, расположенное по адресу: Брестская область, Барановичский р-н, Леснянский с/с, аг. Лесная, ул. 17 Сентября, 44/1.<br>- Капитальное строение, инв. № 110/С-105600 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – склад готовой продукции), площадью 1564,8 кв.м, расположенное по адресу: Брестская область, Барановичский р-н, Леснянский с/с, аг. Лесная, ул. 17 Сентября, 44А/2.<br>- Капитальное строение, инв. № 110/С-105505 (назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – туалет кирпичный), площадью 41,4 кв.м, расположенное по адресу: Брестская область, Барановичский р-н, Леснянский с/с, аг. Лесная, ул. 17 Сентября, 44Б/2.<br>- Капитальное строение, инв. № 110/С-105507 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – склад-ангар), площадью 333,1 кв.м, расположенное по адресу: Брестская область, Барановичский р-н, Леснянский с/с, аг. Лесная, ул. 17 Сентября, 44А/3.<br>- Капитальное строение, инв. № 110/С-105498 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – склад-ангар), площадью 364,5 кв.м, расположенное по адресу: Брестская область, Барановичский р-н, Леснянский с/с, аг. Лесная, ул. 17 Сентября, 44Б/1.<br>- Капитальное строение, инв. № 110/С-107505 (назначение – сооружение специализированное водохозяйственного назначения, наименование – водонапорная башня), объемом 16,0 куб.м., расположенное по адресу: Брестская область, Барановичский р-н, Леснянский с/с, аг. Лесная, ул. 17 Сентября, 44.<br>- Капитальное строение, инв. № 110/С-107993 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – труба дымовая), площадью 0,0 кв.м расположенное по адресу: Брестская область, Барановичский р-н, Леснянский с/с, аг. Лесная, ул. 17 Сентября, 44, труба дымовая.<br>- навес АБК (укрытие велосипедов), площадью 8,75 кв.м<br>- навес АБК (главный вход), площадью 5,6 кв.м<br>- железобетонный забор, протяженностью 932,8 м.п.<br>- внутриплощадочные дороги и проезды, площадью 2180,0 кв.м<br>- деревянный забор охранной зоны артскважины, протяженностью 170,5 м.п.<br>- забор деревянный, протяженностью 390,0 м.п.<br>- ограждение металлическое с воротами, протяженностью 34,43 м.п.<br>- дымовая труба топочной АБК.<br>- пристройка АБК, протяженностью 317,0 м.п.<br>- емкость для ГСМ.<br>- емкость.<br>- емкость.<br>- емкость.<br>- ворота металлические.<br>- резервуар для мазута.<br>- теплотрасса, протяженностью 50 м.п.<br>- водопроводные сети, протяженностью 388 м.п.<br>- силовые кабельные внутренние сети (котельная мастерская), протяженностью 30 м.п.<br>- силовые кабельные наружные сети, протяженностью 1200 м.п.<br>- силовые кабельные внутренние сети ТП (цех № 2), протяженностью 360 м.п.<br>- силовые кабельные внутренние сети ТП (цех раскроя), протяженностью 30 м.п.<br>- силовые кабельные внутренние сети ТП (цех новой продукции), протяженностью 80 м.п.<br>- силовые кабельные внутренние сети ТП (цех ширпотреба), протяженностью 360 м.п.<br>- силовые кабельные внутренние сети ТП (красильный цех), протяженностью 230 м.п.<br>- силовые кабельные внутренние сети ТП (цех столов), протяженностью 60 м.п.<br>- силовые кабельные внутренние сети ТП (гараж), протяженностью 15 м.п.<br>- силовые кабельные внутренние сети ТП (АБК), протяженностью 15 м.п.<br>- силовая наружная воздушная линия, протяженностью 515 м.п.<br>- насос ЦИСГ.<br>- насос паровой.<br>- насос ЭВЦ 6-6,3-125<br>- силовые кабельные внутренние сети ТП (котельная), протяженностью 150 м.п. |

| | |
|---|---|
| **Лот расположен на земельном участке** | Кадастровый номер 120483502601000358, площадью 10,1173 га (назначение – для обслуживания производственных зданий и сооружений) по адресу: Брестская область, Барановичский р-н, Леснянский с/с, д. Лесная |
| **Начальная цена продажи** | 3 714 457 026 (три миллиарда семьсот четырнадцать миллионов четыреста пятьдесят семь тысяч двадцать шесть) белорусских рублей без учета НДС |
| **Сумма задатка** | 185 722 852 (сто восемьдесят пять миллионов семьсот двадцать две тысячи восемьсот пятьдесят два) белорусских рубля |
| **Продавец** | УП «Ружанская мебельная фабрика», 225154, Брестская область, г.п. Ружаны, ул. Советская, 9а, тел. 31-1-91, факс 31-2-67 |
| **Организатор торгов** | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 41-98-34 |
| **Условия аукциона** | Без условий |
| **Условия оплаты** | По договоренности сторон |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | р/с 3012579170017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, БИК 153001739, УНП 500833225. |

**Аукцион состоится 5 августа 2014 г. в 11.00 по адресу: Брестская область, г.п. Ружаны, ул. Советская, 9а**

